Валя Марціновіч ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Лявон літаратар ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 40 (2786) Год LIV | Беласток, 4 кастрычніка 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Фестываль у добрым месцы

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

— Няма ў нас аднаго кіраўніцтва. Мы свайго роду фолькпарламент. Таму назвалі мы сябе „Радай". Любоў да традыцыі і беларускай культуры гэта наш кіраўнік, — сказаў „Ніве" член гэтага мінскага гурту Васіль Грынь у час першага Фестывалю фальклорных калектываў, сарганізаванага на завяршэнне летняга сезона ў нядзелю 27 верасня ў падбеластоцкім Музеі вёскі (скансэне). „Рада" была без сумненняў зоркай гэтага мерапрыемства, у час якога на сцэне паказваўся „тутэйшы" беларускі фальклор.

Да конкурсных змаганняў стала шаснаццаць калектываў з Беласточчыны, Сувальшчыны і Курпяў (а таксама „Рада"). Сярод рэкамендуючых беларускі фальклор, перш за ўсё песні, апынуліся „Чыжавяне" з Чыжоў і дзіцячыя „Пламеньчыкі" са Студзянак пад Васільковам. Іншыя групы, між іншым, таксама выконвалі беларускія творы. Была сярод іх „Вэрвачка" з Орлі, якой таксама беларускіх песень вучыць інструктар з Роўнага на Украіне, ды „Родына" з падбельскага Дубяжына. Паказваліся таксама м.інш. ансамблі, якія спявалі фальклор яўрэйскі, стараверскі, з польска-чарнарускага памежжа і з прыбужскага Падляшша. Фестываль вёў Марк Скамароўскі, які адкрыў яго беларускай песняй „Колькі ў небе зор" (якой выкананне ўразіла журы ў час цяперашняга выпуску TVNаўскай праграмы „Mam talent"). Паколькі быў гэта першы фестываль такога роду, спыталіся мы ў яго арганізатаркі, студэнткі этнамузыкі Юліты Харытанюк (спявала ў „Чарамшыне" ды засноўвала з іншымі пры БГКТ у 2001 г. неіснуючую ўжо „Лучыну"), працаўніцы Музея вёскі, што вырашыла пра выбар калектываў.

— Я выбрала ўжо вядомыя і прызнаныя гурты ды і менш папулярныя. Выбрала тыя, якія лічу, што варта іх паказаць тут, у гэтым месцы.

Гэтае выказванне пашырыў нам член журы, інструктар народнай музыкі Міраслаў Наляскоўкі з Рэгіянальнага асяродка культуры і мастацтва ў Сувалках:

— Тут, у скансэне, у час такога фестывалю, не варта рэкамендаваць калектываў не падыходзячых да месца. Так як нельга ў стаяўшыя драўляныя дамы ўстаўляць сучасныя, пластмасавыя вокны.

Іншы член журы — дырэктар Музея вёскі Артур Гавэл — дадаў:

У час рэпетыцыі „Рады" рашылі сабе патанцаваць у адным з домікаў скансэна сяброўкі калектыву „Родына"

— Залежала нам у першы раз на большай разнастайнасці. У будучыні хочам абмежавацца да калектываў з Беласточчыны.

Культуразнаўца з варшаўскага Інстытута польскага мастацтва Акадэміі навук Дарыюш Гжыбэк (беларус, якога сям'я родам з Гарадзіска непадалёк Ласінкі) тлумачыў:

— У беларускіх песнях Беласточчыны адлегласці паміж паасобнымі гукамі іншыя, чым у песнях і музыцы ў іншых частках нашай краіны, а таксама характэрным з'яўляецца дзяленне складоў. Тут на прыцягальнасць і арыгінальнасць беларускага фалкору ўвесь час мае ўплыў тое, што ўсходняя мяжа закрытая і, іначай чым у іншых рэгіёнах Польшчы, асабліва заходніх, не даходзіць да радыкальнага змяшання лакальных культур.

Які быў крытэрый ацэнкі ансамбляў? Міраслаў Наляскоўскі:

— Мы вылучалі перш за ўсё аўтэнтычнасць выканання, незалежна ад таго, які быў гэта калектыў, з якой культуры ён выводзіцца і г.зв. кансерватарскія дзеянні на творах, якія захоўваюць іх першасны кшталт і ўпісваюцца ў рэканструкцыю мясцовых традыцый. Якраз чыста лакальных, а не толькі стылізаваных.

Тут заахвоціў беларускія калектывы карыстацца спеўнікамі з запісамі арыгінальных песень, таксама тымі ў апрацоўцы Сцяпана Копы:

— Для беларускай ідэнтыфікацыі неабходным з'яўляецца карыстанне ўласнай памяццю, традыцыямі продкаў.

Заадно арганізатары, як і члены журы, адзначалі, што лаўрэаты фестывалю павінны папулярызавацца на агульнапольскіх мерапрыемствах падобнага характару, а перш за ўсё на маючым ужо знакамітую марку фальклорным фестывалі ў Казімежы над Віслай. Дарыюш Гжыбэк (стварыў з Юлітай Харытанюк „Лучыну"):

— На жаль, народныя калектывы і выканаўцы з Беласточчыны, таксама і беларускія, у прынцыпе не паяўлюцца на значных агульнапольскіх фальклорных аглядах. Гэта прыкрае.

Імпрэзу завяршыла забава пры старабеларускіх песнях і інструментах існуючай ад трох гадоў „Рады". Галоўнае ядро гэтага ансамбля — трох мужчын: Алесь Жукоўскі (арфа, ліра, бас), Алег Лукенцаў (гармонік, дуда, баян, высокі голас) і Васіль Грынь (дудкі, басэтля, лыжкі, сярэдні голас). Часта — так як у Музеі вёскі — спадарожнічаюць ім старэйшая дачка Васіля Грыня Данута (скрыпка) і пражываючая цяпер у Польшчы Вольга Шульпянкова (таксама скрыпка). Іх музычным ментарам з'яўляецца вядомы не толькі ў Беларусі Алесь Лось. З членамі групы размаўлялі мы якраз перад фінальнай забавай. Расказвалі, што прафесійна двух з іх з'яўляюцца бізнесменамі, адзін з іх інжынер на аўтазаводзе.

— Мы напалову прафесіяналы, напалову аматары. Стараемся верна трымацца, як можам, традыцыі. Нічога не апрацоўваем — ані вакальных, ані інструментальных твораў. Так як спявалася ды іграла калісь, так стараемся і мы, — прызнаўся „Ніве" Васіль Грынь.

Баравікі і цвікі ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Падчас восеньскага імклівага скарачэння дня чалавека часта агортвае меланхолія. Асабліва, калі за работай, як кажуць, галавы няма калі падняць. Асабліва, калі наслухаешся беларускіх і міжнародных навінаў і паведамленняў. Асабліва, калі задумаешся пра прадажнасць, двурушніцтва айчынных і сусветных палітыкаў...

Слядамі таго што пад вадой ☞ 5

Міра ЛУКША

За Чаромхай ☞ 9

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Палескі Драматычны Тэатр з Пінска

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч

Пінская Шляхта

Гайнаўка, Гайнаўскі дом культуры, 02.10.2009 г. у 13 гадзін

Беласток, Драматычны тэатр ім. А.Вянгеркі, 03.10.2009 г. у 16 гадзін

Бельск-Падляшскі, Бельскі дом культуры, 04.10.2009 г. у 16 гадзін

9 770546 196000

Баравікі і цвікі

Падчас восеньскага імклівага скарачэння дня чалавека часта агортвае меланхолія. Асабліва, калі за работай, як кажуць, галавы няма калі падняць. Асабліва, калі наслухаешся беларускіх і міжнародных навінаў і паведамленняў. Асабліва, калі задумаешся пра прадажнасць, двурушніцтва айчынных і сусветных палітыкаў. Калі кажуць пра мір — справа ідзе да вайны. Калі кажуць пра лібералізацыю — да турмы. Калі пра мірны добры атам — значыць, пра ядзерныя ракеты. Калі пра незалежнасць Абхазіі — значыць, пра акупацыю Грузіі. Пра калектыўную бяспеку — значыць, пра небяспеку незалежнасці. Пра рэкордны ўраджай — значыць, пра хуткі рост цэнаў. Пра адзінага кандыдата ад апазіцыі на бліжэйшых прэзідэнцкіх „выбарах" у Беларусі — значыць, пра пяць „адзіных" і непаўторных. Весела, аж плакаць хочацца. А культурны і адукацыйны ровень сучасных палітыкаў! Аляксандр Лукашэнка „пасяліў" Скарыну ў Пецярбургу, Барак Абама „вынайшаў" аўстрыйскую мову. Уладзімір Пуцін гатовы „мачыць" усіх і ўсюды — і ў сарцірах, і ў бараках. І беднаму небараку чалавеку проста няма куды падацца на гэтым свеце. А тут яшчэ бландынка з чорным пасам па каратэ Даля Грыбаўскайтэ нанесла ўдар пад дых усёй беларускай дэмакратычнай супольнасці.

Рэдкая мажлівасць выбрацца ў лес у грыбы ў такі час успрымаецца як сапраўднае свята душы. Сам факт збору прыродных дароў становіцца няважным, галоўнае — гэта працэс, дыханне водарам хвойніку альбо змешанага лесу, блуканне па моху і ігліцы. Таму на прапанову калегі з дэмакратычнай супольнасці адным днём выехаць за горад на „ціхае паляванне" адгукнуўся я з вялікай ахвотай, нягледзячы на ранні час. Выехалі ажно за мястэчка Азёры, кіламетраў пад сорак за Гродна. Паколькі грыбных месцаў мы не ведаем, тыркнуліся ў лес у адно, другое месца, а ўрэшце заехалі ўглыб досыць далёка. Лясныя дары былі разнастайныя — лісічкі, баравікі, грузды, падасінавікі. Здаровых баравікоў зусім мала, нібы тых сапраўдных палітыкаў (цікава, ці ходзіць Грыбаўскайтэ ў грыбы?). Грыбоў было няшмат, ды настрой істотна прыўзняўся. Але неўзабаве мы агледзелі, што ў нашай машыне прапораты ажно два колы. Сталі вылучаць версіі і аніяк не маглі даўмецца і даць веры, як такое магло здарыцца на ціхіх лясных дарогах. Рабіць няма чаго — з горам папалам памяняўшы адну шыну і падпампаваўшы іншае кола, асцярожна рушылі дахаты. Дзякуй Богу, даехалі дамоў без далейшых прыгодаў. А назаўтра калега тэлефануе і расказвае, што паехаў ён у пункт рамонту аўташынаў, а там яму і кажуць: „Дзядзька, у нас кожны асенні дзень па тры-чатыры такія кліенты, як ты". А рэч у тым, што гэта вясковыя жыхары з хатаў на ўзлеску адмыслова забіваюць у карэнні дрэваў, што прасціраюцца праз лясныя сцяжынкі, вострыя цвікі. Маўляў, няма чаго ездзіць па чужых дарогах і збіраць нашы грыбы.

Да чаго ж мы дажыліся, людцы добрыя!? Спадары праваслаўныя і каталікі абодвух абрадаў!? Суайчыннікі забіваюць цвікі ў карэнні, каб іншыя не ездзілі ў лес. А калі хто прыедзе з малымі дзецьмі і трапіць у такую прыгоду? Выбрацца з незнаёмага лесу не так проста, пакуль каму растлумачыш дзе ты знаходзішся.

На гэтым прыкладзе яшчэ раз пераконваемся, як можна перавярнуць людзям мазгі, давесці да нейкіх біялагічных рэакцый на рэчаіснасць. Тут па краіне чужынскія танкі ездзяць, прасуюць беларускую зямлю. Атамную расійскую станцыю збіраюцца будаваць. Вайсковая ўсходняя прысутнасць становіцца ўсё большай пагрозай суверэнітэту, а значыць і гаспадарчай незалежнасці, асабістай свабодзе асобных грамадзян. Вось пра гэта яны нават не задумваюцца. А тут, бачыш, прачнуўся партызанска-дыверсійны інстынкт! Даеш палкі ў колы, цвікі ў шыны, акуркі ў паштовыя скрынкі А можа так эканамічны крызіс прыціснуў, што шкада таго няшчаснага грыба? Шкада ўсяго і найперш для сваіх, для бліжніх. Няпроста знайсці такім чалавечым, дакладней нялюдскім, паводзінам тлумачэнне.

А ў грыбы мы з'ездзілі яшчэ раз, праз тыдзень. Цяжка чалавеку жыць без лесу...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Смецце ў Орлі

Раней жыхары Орлі накаплівалі адкіды на сваіх панадворках і, найчасцей раз у год, вывозілі іх фурманкамі або трактарамі на звалку. Калі ў Орлі закрылі гмінную звалку і паасобным гаспадарам запрапанавалі ёмішчы, за апаражнянне якіх трэба плаціць каля дзесяці злотаў у месяц, можна было заўважыць цікавыя прыклады чалавечага хітрунства наконт пазбаўлення ад уласных смецяў.

Вось, напрыклад, некаторыя асобы, выходзячы з хатаў, забіралі з сабою напоўненыя смеццем поліэтыленавыя пакецікі і выкідалі іх у кантэйнеры Гміннай управы; былі і такія, што вазілі туды смецце на тачках. Справа доўжылася да таго часу, аж гміна адмовілася ад кантэйнераў і паставіла вулічныя кашы, у якія запоўненага смеццем пакета не ўпіхнеш.

Дайшло да таго, што некаторыя арляне сталі насіць і вазіць смецце на... могілкі; на тэрыторыі гміны былі пастаўлены семнаццаць такіх кантэйнераў. У Орлі такія два кантэйнеры стаялі доўгі час перад брамай могілак, пасля паставілі іх зараз за агароджай, але і адтуль былі яны забраны аж на канец могілак, каб зніклі з вачэй. А зрабілі гэта таму, што даволі часта нейкія асобы прывозілі сюды свае гаспадарчыя адкіды, м.інш. цюкі сена, і кантэйнер хутка запаўняўся. Здараюцца і такія асобы, што не ўкідаюць смецця ў кантэйнер, толькі кідаюць побач, тлумачачы, што ім цяжка адкрыць люк. Такі кантэйнер, які мае ўласніка, прываблівае чужых. Гэта абурае тых, хто аплачвае яго апаражнянне, бо карыстаюцца ім чужыя, часта раскідаючы смецце навокал, і ён становіцца брыдкай візіткай, асабліва ў цэнтры мясцовасці. Так было па вуліцы Аградовай з кантэйнерам гміннага жылога блока непадалёк школы, у які староннія асобы тайком прывозілі нават вялікія адкіды ад хатніх рамонтаў.

Але ёсць у Орлі яшчэ больш дакучлівыя асобы. Вось па вуліцы Крывой ёсць неабгароджаная сядзіба з домам, якой уладальнікі жывуць у Беластоку. І акурат пад вокнамі таго дома нехта выглядзеў сабе выгаднае месца на звалку ўсялякіх адкідаў, у тым ліку і смярдзючых. У мінулым годзе да мяне, як да раднага, звярнулася жывучая побач той сядзібы жанчына з клопатам, што ад таго смуроду немагчыма адкрыць летам вокны. Згодна рэгламенту захоўвання чысціні і парадку на тэрыторыі Арлянскай гміны, за захаванне чысціні, парадку і належнага санітарна-гігіенічнага стану адказныя ўладальнікі нерухомасці. Таму войт напомніў уладальнікаў згаданай сядзібы пра яе ўпарадкаванне. Уладальніца смецця не прыбрала, але абгарадзіла ўчастак з боку вуліцы высокай шчыльнай сеткай, якую ўжо нехта стаў нішчыць. Узровень жыцця грамадства адлюстраваўся нават у якасці адкідаў на звалках і стаўленні людзей да ўсялякага лому. Пры камуне людзі ў прынцыпе выкідалі на звалкі ўсялякую металічную непатрэбшчыну, напрыклад, старыя веласіпеды. Былі, вядома, і такія, што прадавалі металалом у пунктах яго скупкі, якія — геэсаўскія — тады былі нават у вёсках. Ад некалькіх гадоў складана знайсці на звалках металічную непатрэбшчыну, асаблівай папулярнасцю ў збіральнікаў карыстаюцца банкі з-пад піва. І падумаць, што пры камуне такімі банкамі — з Пэвексу ці прывезенымі з замежжа — маладыя людзі ўпрыгожвалі свае пакоі; цяпер іх здушваюць каб прадаць. Бывае так, што калі піва любіць дзедка, то банкі на лом збірае ўнучка.

Металалом збіраюць гараджане і вяскоўцы. Гэта з-за хітрасці першых зніклі з вёсак чыгунныя тапчакі (кераты). Сяляне ахвотна аддавалі іх, а збіральнікі таўклі тапчакі на кускі, каб лягчэй было грузіць. Цяпер такія невялікія тапчакі стаяць памаляваныя перад дамамі сялянскіх нашчадкаў у якасці экспанатаў.

Зараз па вёсках няма металалому. Яшчэ час ад часу паказваюцца грузавікі збіральнікаў металалому, а раней было іх многа і нярэдка бывалі яны вельмі дакучлівымі. Здаралася, што ў адсутнасць гаспадароў яны самі выцягвалі металічныя прадметы. Яны так нахабнічалі, што самі адкрывалі брамы, ламалі замкі, а на пляц уязджаў грузавік з кранам.

Аднойчы з пляца былой арлянскай кафлярні — цяпер прыватнага — зладзеі забралі многа жалезных прадметаў, у тым ліку і ўласнікавы сялянскія прылады. Справа трапіла ў суд, але ні вярнуць пакражу, ні атрымаць за яе кампенсацыю селяніну не ўдалося: зладзеі былі бедныя, не ўдалося з іх нічога спагнаць і добрасардэчны селянін прабачыў ім.

У Орлі зладзеі ўкралі жалезную браму ад гміннай звалкі, а пасля слупкі агароджы. Яны не ганьбавалі нават клапанамі і абшыўкамі каналізацыйных люкаў, а з не вельмі дагледжаных сядзіб забіралі цэлыя ўязныя брамы. Зладзеі могуць абкрадаць таксама могілкі — у недалёкім мінулым каля Рыгораўцаў прапала значная частка металічнай агароджы нямецкіх ваенных могілак з часу першай сусветнай вайны.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Вачыма еўрапейца

Выйшлі насупраць

Яшчэ 10 верасня ў сеймавых кулуарах, зараз пасля завяршэння пасяджэння камісіі нацыянальных і этнічых меншасцей Сільвестр Кавальскі, выконваючы абавязкі дырэктара Беластоцкага асяродка TVP не выключыў у размове з „Нівай", што паўторы нядзельнай праграмы „Беларускі тыдзень" апынуцца ў асенняй „рамоўцы". Быццам бы эксперыментальна іх паўтаралі на працягу лета ад 18.50. З лістом за тое ў канцы жніўня выступіла некалькі беларускіх арганізацый. Паўторы ў „рамоўцы" засталіся. Дзякуючы хадайніцтву беларусаў (а асабліва адказнага за „Беларускі тыдзень" рэдактара Юрыя Каліны), паўтарацца будуць таксама перадачы для іншых меншасцей, пражываючых на Падляшшы. Толькі літоўцы — па тэхнічных прычынах — пазбаўлены такой магчымасці.

— Мы выйшлі насупраць чаканням беларускага асяроддзя і іншых падляшскіх меншасных асяроддзяў, — тлумачыла мне Дарота Кукаўская, адказная за праграмны кшталт TVB.

Пры нагодзе бою за гэтыя паўторы я пачаў задумвацца над тым, чаму якраз 20 хвілін (не ўлічваючы паўтораў) раз у тудзень беларусы могуць гаварыць самі пра сябе ў лакальным тэлеэфіры; раней было 15 хвілін, а іншыя, менш шматлюдныя меншасці, маюць эфірнага часу адпаведна менш. Рэдактар Каліна прыпомніў:

— Так вырашылі першыя дырэктары беластоцкага цэнтра і так засталося. Хоць час меншасных перадач крыху павялічыўся, прапорцыі эфірнага часу для меншасцей засталіся і, што цікавае, ніяк не адносяцца да шматлікасці паасобных меншасцей згодна з апошнім нацыянальным перапісам.

У час апошняга пасяджэння камісіі меншасцей дэпутаты ставілі пытанне павелічэння эфірнага часу меншасных праграм у лакальных асяродках TVP ды большага акцэнтавання меншасных праблем у агульнапольскім эфіры. Несумненна, гэта неабходна, хоць бы па прычыне г.зв. прадстаўляння іміджу меншасцей і іх праблем польскай большасці. За тое гадамі таму стараўся тагачасны старшыня сеймавай камісіі меншасцей Яцак Курань. Юры Каліна сцвярджае, што пасля таго, як не стала Кураня, няма ў Сейме нікога такога, хто б так паспяхова змагаўся за гэтыя справы.

Дыскусія ў час пасяджэння камісіі меншасцей на гэтую тэму амаль сышлася з трывожнымі рашэннямі старшыні (?) цэнтральнага тэлебачання Пятра Фарфала. Першае датычыла спынення адзінай агульнапольскай праграмы для ўкраінскай меншасці „Тэленовыны". Прычыны быццам бы такія: замалая аглядальнасць — больш за 140 тысяч гледачоў, завялікія кошты рэалізацыі — падрыхтоўка адной праграмы каштавала каля 14 тысяч злотых. Аргументы старшыні (?) Фарфала абсурдныя! Праграму глядзела шматкроць больш гледачоў, чым у Польшчы ёсць украінцаў, а гэта значыць, што запатрабаванне на гэтую праграму было і выконвала яна місійную ролю. А калі гаворка аб фінансавых аргументах, дык трапна прыкмеціў член сеймавай камісіі меншасцей Казімеж Куц: „Больш у тыдзень зарабляе трэнер футбольнай зборнай Бенгакер".

Другое рашэнне старшыні (?): спыненне, таксама быццам бы па прычыне коштаў, тэлепраграмы „Студыя Усход" Марыі Пшэломец. Трактавала яна аб праблемах Усходняй Еўропы, асабліва аб суседзях і адносінах паміж імі і Польшчай. Гэта была таксама г.зв. місійная праграма.

Толькі гэтыя два рашэнні трывожаць і хадайніцтва м.інш. за павелічэнне эфірнага часу меншасных праграм мабыць застанецца мрояй. Тым больш што пан Фарфал нядаўна турбаваўся: „Калі ў фінансаванні TVP нічога не зменіцца, будзем мець, на жаль, эскалацыю такіх абмежавальных дзеянняў".

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

У маёй хаце

Занатоўкі з жыцця Валі Марціновіч

Беларускасць

У мяне сапраўды беларускія карані. Бабуля з боку бацькі родам са Слоніма, Вера Ракуцік называлася. А дзед то з Градалёў на рынак ездзіў у Баранавічы.

Слухайце, як нашы хлопцы павыязджалі ў Люблін, то там знайшлі Украіну, а я пытаюся: як гэта так — Украіна? То ж мы тут беларусы! І яны беларусы. Як так лёгка можна стаць украінцам? А тыя ўкраінцы такія нахабныя.

Я добра памятаю, што калі трэба мне было ўвесці інфармацыі ў пасведчанне асобы, спыталася я тады ў бацькоў, што гэта такое нацыянальнасць і што мне напісаць. А яны адказалі проста: „Ты беларуска".

Не люблю

Мне перашкаджае і не падабаецца зараз, што людзі на сябе як сабакі брэшуць. Не ходзяць адзін да другога, не хочуць размаўляць, кожны пільнуе свайго носа.

Варта

Варта чакаць пенсіі. Ужо не трэба бегчы да сена, не трэба пару дзён капаць бульбы, ёсць урэшце час на кветкі і на спеў. Калі хтосьці кажа, што на пенсіі кепска, дык грашыць. Праўда, нам крыху дочкі дапамагаюць, але калі гляну ў мінулае, то мне здаецца, што зараз — мой час! Трэба толькі добра гаспадарыць грашыма і часам!

Праблемы? Толькі хвароба з'яўляецца праблемай. Што самае важнае: каб нас хвароба не змагла і каб дзеці былі шчаслівыя.

Гаспадыня

Мае караваі — па ўсёй Польшчы! І ў Гожаве-Велькапольскім, і на поўдні. Былі мае караваі на вяселлі ў прафесара Латышонка і ў Сулімаў з Бельска-Падляшскага. Каму трэба, таму раблю. Настаўніца з Бельска, Аня Бжазоўская, таксама прывозіла да мяне дзяцей, пяклі каравай, ляпілі гускі. Такі практычны ўрок атрымаўся. Караваі магу пячы з заплюшчанымі вачыма. Квашу агуркі, люблю збіраць грыбы і вару смакавіты боршч з баравікоў на Каляды. З адных баравікоў! Ён тады мае такі залаты колер, з лёгкім кіслым араматам. Такі высакародны. Вышываю і вяжу кручком, для сябе і блізкіх, ходнікі ці пакрывалы.

Хацела быць такой сапраўды добрай жонкай. Чула ўсялякія гісторыі і марыла, каб у нашай сям'і згодна жылі. Так дагаджала ўсім, што мяне выкарыстоўвалі — гэту маю адданасць і дабрыню. Таму ў жыцці ўсяляк бывала... Але зараз ёсць сапраўды класна. Добра. Так магу сказаць. Маю дзве дачкі. Адна нарадзілася ў 1965, малодшая — у 1971 годзе. Старэйшая дачка ўжо кажа, што замуж не пойдзе. Такое яе рашэнне. Не хвалююся, бо дзецьмі я ганаруся як пава! У мяне мноства здымкаў. Дзяўчаты прывозяць адразу ў рамках, а мы толькі іх давешваем у калекцыю *(усмешка)*. У студзені я стала ўрэшце бабуляй. Для нашай унучкі, Басенькі, я падрыхтавала нават альбом. Аглядаючы яго ўсё смяюцца і ўголас каментуюць, бо побач здымкаў прыдумала я такія жартоўныя надпісы („Бася праўдападобна шчаслівая, дзед нібыта таксама"). Каментую міны і настроі. Каб было па-іншаму. Люблю жартаваць і смяяцца.

Люблю, калі ўсё ў парадку, ці ў хаце, ці на панадворку. Але не бегаю за ўсім як шалёная. Калі не паспею з нечым, не буду з гэтай прычыны нервавацца.

У хаце я была найстарэйшая. За гаспадаркай свету не бачыла, не таму, што так закаханая ў яе, але трэба было рабіць. З жалем, са злосцю, але тады іншага свету не ведала. Можа таму зараз дыхаю на поўныя грудзі.

Цяга

Мы з мужам у асноўным займаемся крыжаванкамі. Гэта забірае нам мноства часу. Дочкі нам у падарунак купляюць іншамоўныя слоўнікі, бывае, што і такія спецыяльныя для фанатаў крыжаванак. Гэта такое практыкаванне для мазгоў, можна сказаць трэнінг, каб Альцгеймер не дастаў *(смех)*.

Чытаю. Але ў асноўным газеты. Падпісваюся на „Кур'ер паранны" і тыднёвік „Angora". Чытаю ад коркі да коркі, апрача таго што пра спорт, бо гэта мяне не цікавіць. Муж аглядае той увесь спорт, але часам, калі пры нагодзе крыжаванкі спытаюся пра нейкае прозвішча спартсмена, дык адказ амаль кожны раз такі самы: „Не ведаю", „Не помню". — „Так ты і аглядаеш гэты спорт!" — адказваю.

Адвага

Не люблю, калі мяне хваляць. Я займаюся сваімі справамі, а наогул раблю так, каб перадусім я была задаволеная. Лічу сябе адкрытым чалавекам. Не баюся праўды сказаць і не люблю хаваць перад людзьмі нічога.

Так, не хаваю, што шмат часу праводжу і перад тэлевізарам. А чаго тут саромецца? Аглядаю гэтыя польскія серыялы, бо ў іх паказваюць жыццё звычайных людзей. Калі няма нічога да работы, дык сяду і так гляджу па чарзе „Першае каханне", „M. jak miłość", „Само жыццё", „Клан".

Ужо, здаецца, год ці два не падпісваюся на „Ніву". Некаторыя артыкулы ёсць вельмі цікавыя, праўда, але яна стала вельмі палітычнай. Там павінны апісвацца нашы добрыя справы. Кепскія таксама, гэта праўда, бо колькі нас ёсць, але лепш будаваць пазітыўныя адносіны! Зараз адзін на аднаго сабак вешаюць! Можа хто і любіць тыя палітычныя справы, але чаму наверх вылазяць такія прыкрыя факты, злосць, нянавісць? Навошта пляваць! Так у нас ёсць. Як людзі не мелі грошай, дык добра жылі. А зараз грошы дзеляць. Нас мала і трэба жыць згодна, прынамсі перад чужымі.

Кампанія

Была дэлегатам БГКТ. Сядзела ў камісіях. Яшчэ не так даўно актыўна дзейнічала. Але зараз ужо мне не хочацца! Лепш заняцца тым, што задавальняе *(усмешка)*. Спевам.

Быў у нас калектыў у Красным Сяле. Бегала як тая сучка па хатах і атрымалася так, што гэта ўсё для мяне. Быццам бы толькі для мяне патрэбнае. Хацелі бабы спяваць і ездзіць, але Валя ўсім мусіць заняцца. Усіх склікала я, каля дзесяці гадоў працавалі нашы „Красуні". Але я адчувала, што калі кудысьці паехалі — гэта нібыта для мяне. То ж гэта для іх! Паедзеш між людзей, паглядзіш на іншых, людзі на цябе паглядзяць... Мы, як едзем на тыя фэсты ці фестывалі, дык разумеемся лепш чым сёстры. Абмен рэцэптамі, хто як грыбы рыхтуе, салат, — такія блізкія нам, штодзённыя тэмы. У пэўны момант засталася я адна, пару гадоў таму. Але я не думала сядзець! У Малінніках быў таксама калектыў. Крыху старых бабаў адышло і кіраўнічка прапанавала мне далучыцца. Зараз спяваю ў Малінніках! Часта не рэпетуемся. Толькі перад выездамі. Шэсць асоб, а амаль кожная з іншай гміны. Паказваем абрады. Нядаўна запрасілі мяне ў якасці каравайніцы на абрад вяселля. Хтосьці спытаўся ў мяне, дакуль буду спяваць. І што я адказала? —„Пакуль змагу залезці на сцэну!"

Люблю людзей і кампанію. Не люблю сядзець закрытая дзесьці ў куце. Люблю проста спяваць. Калісь была трэма перад выступленнем, зараз ужо не.

Мама спявала. І яе бацька, але яго вывезлі ў Сібір і ён ужо не вярнуўся. А мама спявала многа. Ездзіла і з кумою, у дуэце спявала таксама. Не было калі нас вучыць спеву, але пры нагодзе гасцін, напрыклад на Ілью, мама з бацькам, супольна са сваякамі спявалі, то я прыслухоўвалася і вучылася пры боку мамы. Яны пераважна рускія пасляваенныя песні спявалі. Пазней, калі я ўжо ў калектыве пачала спяваць, то і ад суседак бралі рэпертуар. „Цёгалі за язык". А цяпер у Малінніках, напрыклад, ездзілі з „Перапяліцай". Пастаноўка ўзнікла ўжо на аснове нашага вопыту.

У царкву ад нас далёка, бо наша парафія ў Вульцы-Выганоўскай. Можа каб была бліжэй, я і ў царкве таксама спявала б. А так мяне не цягне да царкоўных спеваў. Калі хтосьці памрэ, памагаю як пеўчая, бо ведаю тыя песні. Але не імкнуся да царкоўнага рэпертуару. Мяне цягне да жыцця, да радасці, а гэта ёсць хаця б у нашых абрадных песнях. Вясёлых, жартоўных пастаноўках. Люблю жыццё.

Выслухала Ілона КАРПЮК

На культурнай ніве

Свойская імпрэза

12 верасня, у суботу, у Чаромсе пад адкрытым небам адбыўся канцэрт з цыкла „Украінскія традыцыі і трансфармацыі", арганізаваны мясцовым ГОКам і Саюзам украінцаў Падляшша. Гэта другое мерапрыемства чаромхаўскага цэнтра культуры па-за фолькавымі сустрэчамі „З вясковага панадворка", якому як самаўрадавыя ўстановы, так і спонсары аказваюць падтрымку (на жаль, беларускай імпрэзай такога рангу ў Чаромсе не можам пахваліцца). Шкада, што надвор'е чарамшанам не паспрыяла. На сёлетніх фолькавых сустрэчах, як і зараз ішоў дождж і канцэрты пад адкрытым небам адбываліся пры не надта вялікай аўдыторыі. Прыхіляюся да меркаванняў чаромхаўскага асяроддзя і кірую заўвагу у адрас арганізатараў: „Даражэнькія, не адтэрміноўвайце канцэртаў на восень. Шкада спонсарскіх грошай!"

Суботні канцэрт складалі дзве часткі: фальклор і традыцыя ды фольк і трансфармацыя. Рэпертуар абодвух жанраў быў багаты і разнародны, таксама, як і лік выступаючых гуртоў. Паказалі сябе на сцэне калектывы з Гайнаўшчыны і суседніх Бельскага і Сямятыцкага паветаў ды госці з Беластока („Грамада"), Любліна („Дрэвутня") і Гурова-Ілавецкага („Irish"). Канцэрт, пры нешматлікай публіцы, пачаўся з паўгадзінным спазненнем. Большасць гледачоў складалі дзеці ды школьная моладзь. Іх вабілі латкі з цацкамі ды смакоццямі. Піўны завод „Дайліды" для аматараў піва падрыхтаваў столікі пад парасонамі з лагатыпам маркі „Жубр". Пры іх згуртавалася большая частка мужчынскага полу.

З ходам часу людзей прыбывала. Дождж перастаў ісці, але вячэрні вецярок пранізваў сквось плечы. Я паглядзеў адно першую частку канцэрта. Усе калектывы прэзентавалі вядомыя песні, якія даўней спяваліся на вячорках і забавах. Немагчыма пералічыць выканаўцаў, як і прэзентаваных песень, бо імпрэза доўжылася некалькі гадзін. Я пакідаў яе ў поўным разгары, калі канцэртавала „Грамада" з Беластока. Было гэта а палове дзевятай вечара. Пазней быў арганізаваны конкурс „Спявай па-свойму". Імпрэза завяршылася народнымі танцамі пад гукі „тутэйшай" фолькавай музыкі.

Уладзімір СІДАРУК

Як дайсці ў Саўляны?

У вёску Саўляны, што пад Беластокам (у бок Грабоўкі), можна дайсці напрасткі сцяжынкамі. Ад аўтобуснага прыпынка гарадской лініі „13" будзе паўтара кіламетра. Ісці дык ісці, але...

У самым пачатку сцежка-дарожка — пясчаная і вядзе цераз лес. Пасля двух паваротаў — адзін управа і адзін улева — яна ўлетку зарослая густой травой ды ўсялякім пустазеллем. У палавіне гэтай сцежкі ёсць і балоцісты адрэзак побач ставу, а далей пад горку ды зноў пясчанымі палоскамі-раўчукамі.

Пры ўсім гэтым сцяжынка на сваім працягу перасякае ворнае поле. Яно з двух бакоў. А сяляне як сяляне, калі аруць вясною або капаюць восенню, разрываюць плугамі тую сцяжынку так, што на ёй лёгка ногі скруціць.

Пра сцежку ў Саўляны ніхто не дбае!

(яц)

І тут жывуць людзі

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Удала выступіў беларускі калектыў „Арляне"

Жыхары Рудутаў, што на акраіне Арлянскай гміны, з нецярплівасцю чакалі беларускага фэсту, ладжанага Музеем і асяродкам беларускай культуры ў Гайнаўцы з дапамогай гмінных улад і мясцовага насельніцтва, які быў ужо чарговым мерапрыемствам арганізаваным у рамках праекта „І тут жывуць людзі". Такія ж імпрэзы адбыліся ўжо ў Арэшкаве (Гайнаўская гміна), Скарышэве (Нарваўская гміна) і Вітаве (Дубіцкая гміна).

Рудуты — немалая вёска, вядомая з-за музычных здольнасцей моладзі, пражываючай там у мінулым. Летам частымі ў гэтым сяле былі спевы на лавачках. Сцяпан Копа з ВААК сабраў і запісаў у гэтай вёсцы песні, якія праспявалі перад ім бабулі і прабабулі сённяшніх дзетак і моладзі. Аднак, папраўдзе, цяпер мала там наймалодшых жыхароў, якія ў кожным сяле вырашаюць аб яго будучыні. Рудуты пусцеюць, так як суседнія Тапары ці Рутка. Толькі адзінкі з гэтай вёскі рашыліся гаспадарыць на крыху большым арэале, чым гэта рабілі іх дзяды. Астатнія абрабляюць свае палеткі разам з сямейнікамі. Многія дамы пастарэлі, як іх уласнікі, а некаторыя ўжо і пустуюць. Летам у Рудуты прыязджаюць на адпачынак гарадскія дзеці і ўнукі і тады больш гоману ў сяле. Восенню і зімою вёска прыціхае.

20 верасня жыхары Рудутаў чакалі асаблівага святкавання з беларускай песняй і музыкай. У сонечны дзень перад сцэнай побач святліцы сабралася многа людзей сталага ўзросту. Менш прыйшло дзетак і моладзі, але іх вельмі мала ў Рудутах і суседніх сёлах. Мерапрыемства ўдастоілі войт Арлянскай гміны Пётр Сэльвесюк і частка радных.

Спачатку выступіў дзявочы калектыў Белавежскага асяродка культуры, а пасля з народнымі песнямі ўдала запрэзентаваліся „Малінкі" з Маліннік. Цікавым атрымаўся выступ дзіцячага гурту „Жэўжыкі" з бельскай „тройкі". Дзяўчаткі і хлопцы спявалі песні і гаварылі вершыкі па-свойму.

— Пад Рудуты мы падрыхтавалі новы матэрыял. Мы з Марыяннай Ваўрусевіч рыхтуем усе выступы толькі на сваёй мове. У час рэпетыцый, што адбываюцца раз у тыдзень, гаворым да дзетак на нашай мове і вучым, каб і яны стараліся размаўляць з намі пасвойму, — сказала бібліятэкарка-настаўніца з „тройкі" Анна Фіёнік.

Тэатральная група „Сявенька", што дзейнічае пры Беларускім музеі, выступіла з пастаноўкай „Вяселля", якую паказвала ўжо раней у некалькіх месцах. Аднак кожны выступ гэта дадатковы вопыт і ўмеласці. Маладыя акцёры з гайнаўскіх школ, паказваючы вясельныя абрады ў Арлянскай гміне, былі яшчэ больш адважнымі, чым у час ранейшых выступаў. Спяваючы песні на беларускай літаратурнай мове калектыў „Арляне", які можа пахваліцца доўгай, бо звыш шасцідзесяцігадовай дзейнасцю, заваяваў вялікае прызнанне публікі і атрымаў гарачыя апладысменты.

— Наш гурт „Мальва", што дзейнічае пры Беларускім музеі ў Гайнаўцы, узнік спантанна. У нашым рэпертуары маюцца між іншым беларускія песні. У Паўліны Паўлючук і Юліты Назарка ёсць вопыт у „Знічцы", а я спявала ў калектывах гайнаўскай „шасцёркі". Рашыліся займацца і выступаць супольна, а сёння — пад акампанемент калектыву „Нарва", — заявіла Марыёля Герман з Гайнаўкі, якая разам з Паўлінай удала вяла мерапрыемства. Таксама самастойна выступіў малавядомы шырэйшай публіцы калектыў „Нарва" з Нарвы, што прэзентаваў даўнейшыя папулярныя творы. Сённяшнія папулярныя песні падрыхтавалі хлопцы з гурту „Selectiv" з Арэшкава, з беларускім рэпертуарам выступіў калектыў „Чыжавяне", а па-свойму спявала „Вервачка" з Орлі. Калектыў „Калінка" з Залук, што меў выступіць апошнім, вядомы з-за прыгожага рэпертуару на беларускай літаратурнай мове. Людзі з трох гмін, сабраныя на фэсце ў Рудутах (распаложаных у суседстве з Кляшчэлеўскай і Дубіцкай гмінамі), былі рады, што не забылі пра іх.

Нашы калектывы прыязджаюць на музейныя фэсты з цыкла „І тут жывуць людзі" з неапрацаваным фальклорам, сабраным на Гайнаўшчыне, апрацаванымі песнямі і прэзентуюць больш сучасныя творы на беларускай літаратурнай мове. Ёсць песні, што спяваюцца без акампанементу, каб слухачы лепш пачулі словы і звярнулі ўвагу на мелодыю, якая бывае знаёмай найстарэйшым людзям. Творы, што пад акампанемент гітар і ўдарных інструментаў выконваліся на забавах у васьмідзесятых ці дзевяностых гадах і зараз спяваюцца на вясельных мерапрыемствах, падабаюцца вясковым людзям сярэдняга ўзросту, якія наогул не ганьбуюць яшчэ простымі кампазіцыямі і меладычнай музыкай, на якой выхоўваліся ў моладасці. У агульным на беларускіх музейных фэстах збіралася многа людзей, каб паслухаць музыку.

Старэйшыя людзі радаваліся, што не забылі пра іх

— На фэсце „І тут жывуць людзі" ў Вітаве сабраліся сотні людзей, — заяўляе дырэктар Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы Ян Карпюк. — Даўно не было там беларускага мерапрыемства і людзі з захапленнем глядзелі на выступы сваіх калектываў.

З цікавасці да роднага людзі прыходзілі на фэсты ў Арэшкаве і Скарышэве.

— На нашых мерапрыемствах выканаўцы спяваюць па-беларуску, бо Музей і асяродак беалрускай культуры быў створаны, між іншым, для прапагандавання беларускай культуры, — кажа яго дырэктар Ян Карпюк. — Гэты рэпертуар падабаецца нашым людзям. Яны гавораць, што „слухалі нашы песні".

Жыхары Скарышэва можа і не разлічвалі ўжо на беларускі фэст у іх невялічкай вёсцы. Слухаючы народныя песні, старэйшыя ўспаміналі моладасць і радаваліся, што не забылі пра іх. Арганізатары фэстаў карыстаюцца дзвюма назвамі фэсту. Калі прыедуць, выступаюць пад лозунгам „І тут жывуць людзі", але калі запрашаюць на мерапрыемствы, пішуць „І там жывуць людзі", адклікаючыся да жыхароў канкрэтнай вёскі.

— У рамках праекта „І там жывуць людзі" мы запланавалі ў гэтым годзе 9 фэстаў з фінансавай падтрымкай Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі. У час рэалізацыі гэтага праекта рашыліся не паказвацца перад вялікай публікай у Гайнаўцы, Бельску ці большых гмінных мясцовасцях, але перад усім дайсці да жыхароў невялікіх сёл, або большых вёсак, жыхары якіх даўно не бачылі выступаў падобнага характару, — гаворыць дырэктар Ян Карпюк. — У восеньскі перыяд хочам наладзіць яшчэ фэсты, між іншым, у Кляшчэлеўскай, Чаромхаўскай і Чыжоўскай гмінах. Бярэм пад развагу ладзіць у бліжэйшы час мерапрыемства ў Дабрывадзе або Палічнай (Кляшчэлеўская гміна) і Асоўцы (Чыжоўская гміна). Аднак аб канкрэтнай даце фэсту ў выбранай намі вёсцы вырашаем на некалькі тыдняў да запланаванага мерапрыемства, звяртаючы ўвагу на іншыя імпрэзы, якія могуць ладзіцца ў гміне. Хочам мець публіку ў выбраным намі сяле таксама і з іншых вёсак.

Слядамі таго што пад вадой

Семяноўскае возера ў даліне верхняй Нарвы — сюды прыляцелі і пасяліліся ўжо даўно водныя птушкі, а людзі адляцелі. Узнікла яно ў 1977-1990 гадах у выніку спынення вады зямной дамбай у рукаве ў раёне Лукі і Рыбакоў. Паверхня вады пры мінімальным узроўні на парозе 142,30 метраў над у.м. — 11,7 кв. км (максімальна 32,5 кв. км), умяшчальнасць вадасховішча — 17,5 млн. кубаметраў вады (цалкавітая — 79,5 млн. кубаметраў), сярэдняя глыбіня — 1,5 м. Пяць бакавых дамбаў даўжынёй 8 250 метраў...

Будаваў яго між іншым Аляксандр Кардаш. Сёння ён на трэцяй сустрэчы былых жыхароў былое вёскі Рудні, якая разам з іншымі — Будамі, Боўтрыкамі, Гарбарамі і Лукой — апынулася пад вадой. Ён будаўнік гэтага возера.

Аляксандр Кардаш сабраў многа з былога ўтопленых вёсак

—Так, з гэтым вадасховішчам я звязаны ад пачатку яго пабудовы, — кажа Аляксандр, а ў яго руках кніжкі і папкі з дакументамі ды здымкамі. — А з гэтай зямлёю я звязаны ад нараджэння. Мая бабуля паходзіць з сярэдзіны гэтага заліва — з вёскі Боўтрыкі. Гэтую вёску ўсю выселілі. Яе зліквідавалі. Яе няма... А я жыву ў Бандарах і працую пры эксплуатацыі нашага заліва.

Аляксандр Кардаш не пакідае ні адной з сустрэч жыхароў утопленых вёсак. Ён адзін з іх арганізатараў і не прыходзіць на іх з пустымі рукамі...

— Сам паходжу з вёскі Навасады. Тут сустракаюся з людзьмі, якіх мы выкінулі з бацькаўшчыны. Яны маюць цяпер да нас прэтэнзіі, што мы іх адсюль сілай выселілі. Я тут толькі працую, выконваю свае абавязкі. Я гэтых людзей разумею. Яны згэтуль паходзяць, звязаны з кожным карэньчыкам, дрэўцам, корчыкам, з суседзямі. Разумею іхні боль. Ведалі яны і сваіх суседзяў, хадзілі на другі бок ракі. У Луку. Там было больш за 150 гаспадарак. Жылі дружна, сустракаліся, гулялі... Мусілі з усім гэтым расстацца. Мусілі выбрацца на свае новыя месцы. Я рашыў гэта захаваць, каб бяспамяцце пра гэтыя месцы і гэтых людзей не заліла ўсяго як гэтае возера.

Аляксандр Кардаш збірае крышынкі памяці, ходзячы ад дому да дому да гэтых людзей. І наведвае архівы.

— Ад васьмі гадоў збіраю дакументацыю. Матэрыялы сканірую, каштоўныя арыгіналы вяртаю. Вельмі ўсім дзякую за тое, што яны мне гэта пазычаюць. Хачу апісаць жыццё кожнай вёскі, лёс усіх разам і канкрэтных людзей, у кніжцы. Вядома, гэта каштуе і час, і грошы. Калі ўсё збяру, прыйдзецца пашукаць спонсара. Хачу сабраць весткі не толькі з апошняга перыяду жыцця гэтых вёсак. Быў такі час, калі гэтым земляробам нельга было будаваць дамоў, платоў. Жылі ў няўпэўненасці. Сказалі ім, што будуць мусілі пакінуць сваю бацькаўшчыну. Іх родныя прывыклі да таго, што штосьці адбывалася з іх бацькаўшчынай. Праходзілі цяжкія часы — войны, бежанства, перасяленні... Скажам, мая бабуля была аж у Краснаярскім краі. Давялося нашым людзям хлябнуць гора не раз. Хачу запісаць у гэтай кнізе і старэйшыя перажыванні нашых жыхароў, іх роздумы, і з апошняга часу. Нашы людзі вярнуліся з бежанства ў дваццатыя гады на зарослыя палеткі. Адбудоўваліся, сваю зямлю даводзілі да ўрадлівасці. Бывала, што па бульбіне збіралі з раскапаных ужо загонаў. А гэтую зямлю ў іх забралі.... Людзі мусілі заўсёды дастасавацца да канкрэтных сітуацый, каб выжыць. І гэта таксама хачу захаваць — паказаць характар людзей. А гэтыя здымкі, што мне ўдалося сабраць, расказваюць як людзі жылі. Здымкі хат, млыноў, школ, людзей на вясковых сходах, у час працы і забавы, у час страйкаў (тут у нас быў страйк арэляў), з усялякіх арміяў. Куды нашых людзей не насіла! З кожным здымкам звязаны лёс канкрэтнага чалавека. Калі я рабіў кніжачку пра руднян, збіраўшы матэрялы, не запісаў толькі аднаго — колькі было католікаў, колькі праваслаўных. Здалося мне, што гэта няважнае. А з давайны трэба было б пералічыць яшчэ і яўрэяў. Памятаюцца яшчэ імёны людзей. Вось на гэтым здымку ёсць бабулька... Тут яна яшчэ дзяўчынка, сядзіць на каленях свайго дзедкі, а сёння ёй 80 гадоў. Можна запісаць яшчэ жывыя ўспаміны. Можна даведацца пра канкрэтныя дэталі. Трэба запісаць усё што яшчэ можна. Каб захаваць памяць пра гэтых людзей, што адсюль выйшлі, робім сустрэчы, і я да гэтага далучаюся. Кожнаму з прыбылых на сустрэчу хачу даць пакуль што па маленькай кніжачцы з таго, што ўдалося мне сабраць — кожнаму з яго вёскі. А параз'язджаліся яны па ўсёй Польшчы. Гэта і тыя старэнькія, што ўжо не далі рады далей адысці, што прытэпаюць на палачцы да „свайго" крыжыка, і тыя, каго раней панеслі ў свет патрэба, навука, праца. Іх усіх сюды цягне. І хоць ужо паніхідныя больш успаміны, такі балючыя... Такія сустрэчы — дзеля памяці, каб сустрэцца, паўспамінаць пра мілунае, падумаць пра будучыню.

Я штодзённа гляджу на гладзь вады, якая заліла былое нашых вёсак. Не можа яна заліць памяці. Першую кніжачку зрабіў быў я для жыхароў былых Буд, пасля — для жыхароў Лукі, якія сабраліся былі пры новапастаўленым помніку-крыжы, там, дзе стаяў адыходны лучанскі крыж. Скаталагаваў усе матэрыялы. Апрацаваў вёску Гарбары, цяпер збіраю хутары Семяноўкі, Тарнопаля...

Падрыхтаваў ужо падборку матэрыялаў, каб прапанаваць войту і бурмістру.

— Бо ж не пакажашся ў іх з пустымі рукамі. Дзеля таго, каб атрымаць нейкую падтрымку для выдання гэтай кнігі. Бо ж не можа яна выглядаць так саматужна, як гэтыя кніжачкі, якія я прапанаваў да гэтай пары. Возера распаложана на тэрыторыі двух паветаў — Беластоцкага і Гайнаўскага, і дзвюх гмін — Міхалоўскай і Нараўчанскай. Людзі жылі разам — іх рака не дзяліла. Таму кніга павінна быць адна. І хачу пра гэтыя пуці напісаць, што пралягаюць праз возера, з 1909 года. Цэлую іх гісторыю і значэнне. Прывесці і анекдоты, і быль. Успаміны і рэальнасць, увекавечаную фотаапаратам і пісьмом. Каб, узяўшы кніжку ў рукі ўбачыць іх усе: Луку, Гарбары, Рудню, Боўтрыкі, Буды... Палістаць старонкі лёсаў гэтых старых беларускіх вёсак.

Марыя Хлябіч і Віктар Бура: — Там вось стаяў дом Зюзяў на хутары Цясноўскія

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Брама ў Нацыянальны парк

Брама ў Нацыянальны парк у свае раннія гады

Гэтую сімвалічную, драўляную браму памятаюць усе тыя, хто некалі наведваў найбольш цэнную частку Белавежскага нацыянальнага парку — раней называнаю дакладным запаведнікам прыроды, а зараз абшарам дакладнай аховы. Яе паставілі ля ўвахода ў запаведнік, з боку Белавежскай паляны, у 1930 годзе. Значыць, браме ў будучым годзе споўніцца 80 год.

Брама праектавалася ў 1929 годзе ў Кракаве. Над праектам працавалі супольна новы кіраўнік парку Ян Ежы Карпінскі, інжынер-архітэктар Генрык Ясенскі і батанік Уладыслаў Шафер. Узвядзенне брамы з надпісам „Нацыянальны парк" нейкім чынам апярэдзіла перайменаванне Надлясніцтва Запаведнік у Нацыянальны парк у Белавежы, што наступіла толькі ў 1932 годзе. Брама гэтая стала бяльмом на воку тагачаснаму дырэктару Дзяржаўных лясоў у Белавежы інжынеру Антону Сыму. Публічна дэманстраваў ён свой супраціў адносна ідэі ўзвядзення брамы, не пазбягаў таксама прыдзірак да яе ініцыятараў і выканаўцаў. Успамінае аб гэтым Уладыслаў Шафер у артыкуле „Першыя лісткі гісторыі Белавежскага нацыянальнага парку", змешчаным у часопісе „Kosmos" (№ 5 з 1957 г.).

Брама цэласна выкананая з дубовага дрэва, разам з размешчаным на ёй надпісам. Гэта твор рук цесляра з Заставы Стасюка.

Падчас II сусветнай вайны надпіс „Нацыянальны парк" з брамы ўстаранілі. Але зараз жа пасля вайны яго вярнулі. Тадэвуш Шчэнсны ў кракаўскім часопісе „Chrońmy przyrodę ojczystą" (№ 2 з 1946 г.) паведамляў грамадству: „Над уязной брамай узнавілі ўжо даўні, устаранёны акупантам надпіс „Нацыянальны парк" — дакладна паводле першапачатковага ўзору".

Збігнеў Кавальскі, знаходзячыся ў 1947 годзе ў Белавежы на паляванні на глушцоў, гэтак на старонках перыядычнага выдання „Łowiec Polski" (№ 2 з 1947 г.) успамінаў праезд праз браму: „Каб адчыніць вароты, пабудаваныя з масіўных бярвён, якія свецяцца яшчэ светлай свежасцю і вядуць у запаведнік, праз які вядзе найбольш кароткая дарога ў Броўск, трэба пераадолець сур'ёзныя праблемы. Дзякуючы Богу адзін з возчыкаў выцягвае з кішэні ключ велічынёй дуэльнага пісталета, відаць часта скарыстоўваны як адмычка ад брамы Нацыянальнага парку, якая ў асноўным адчыняецца толькі за дня і толькі на падставе пропуска, выдадзенага дырэктарам Карпінскім". Аўтар успамінае яшчэ, што ўязная брама „прыкрытая гонцікамі".

У васьмідзесятых гадах брама прайшла капітальны рамонт. У той час зрабілі ў яе бетонныя падмуркі, што несумненна прадоўжыць браме жыццё.

Брама стала ўжо адным з сімвалаў парку — яе здымкі змяшчаюцца амаль ва ўсіх даведніках і альбомах аб Белавежскай пушчы. На яе фоне турысты выконваюць сабе здымкі на памяць. Значыць, ідэя ўзвядзення брамы цалкам апраўдалася, насуперак яе апанентам.

Пётр БАЙКО

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

У бельскай „тройцы” знаёмяцца з „Зоркай”

На сустрэчу з „Зоркай” чацвёртакласнікі бельскай „тройкі” прынеслі з хаты старыя экземпляры „Нівы”. Адзін нумар газеты быў з 1993 года. Для дзяцей, якіх яшчэ тады не было на свеце, ён здаваўся „старажытным”.

— Гэтую „Ніву” дала мне мая бабуля, — кажа сімпатычная дзяўчынка.

Старая газета зрабіла вялікае ўражанне. Сёння прачытаеш газету і выкідаеш яе на сметнік. А тут такое цуда — газету трымаюць гадамі ў хатах, як скарб! Бо яна на нашай роднай мове. І ўсярэдзіне — „Зорка”. З яе старонак усміхаюцца нам прыгожыя тварыкі дзяцей і моладзі. Тут і „нягжэчныя” жывінкі з глыбінкі, крыжаванкі, музычныя партрэты.

Вучні чацвёртага „б” класа — дэкламатары. Лукаш Філіпюк і Гжэсь Зіневіч дайшлі аж да цэнтральнага этапу „Роднага слова”. Хлопцы гавораць таксама пра конкурс „Паэтычнае трохгалоссе”, які ладзіцца ў іхнім горадзе Бельску-Падляшскім.

— Ці больш карысна гуляць у камп’ютэрныя гульні, — спыталі мы ў сяброў, — ці больш карысна чытаць кніжкі?

Адказы былі амаль адназначныя:

— Дзякуючы кніжкам, мы маем уяўленне, — адказала Оля Лажэцкая.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Дзяўчынка любіць прыгодніцка-падарожныя кніжкі. І вось у апошні час захапіла яе „вандроўка” разам з кніжкай па Беларусі. Сябры слухалі з прыадкрытымі роцікамі. Мала хто з іх адважыўся ўжо прачытаць кніжку на беларускай мове. За свой расказ Оля атрымала наш падарунак: кніжку „Муха ціп-топ”. У класе ўсе будуць мець магчымасць дасканаліць беларускую мову і знаёміцца з літаратурай, музыкай, гісторыяй родных мясцін. Усе вучні, 22 асобы, падпісаліся на нашую газету. Напэўна, вялікая тут дапамога іх новай выхавацелькі. Спадарыня Валя Бабулевіч гадамі супрацоўнічае з нашай газетай і добра ведае колькі карысці ды прыгожых хвілін можна даць дзецям і школьнікам праз нашу газету.

Ага, неўзабаве, „Зорка” выйдзе каляровай!

ЗОРКА

Лідзія МАЛІНОЎСКАЯ

Наш Дырэктар

У бельскай школе беларускай ёсць начальнік-старшыня.
Усім дзецям і дарослым ён заўсёды галава.
Злосны ён на плеткароў, накрычаць на іх гатоў.
Вусы гладзіць ён далоняй. Яго вус — заўжды ў фасоне!
Дзеці ведаюць усе — калі кліча да сябе,
Узлаваўся не на жарты: відаць, наганяю варты.
Ён вясёлы і цікавы, паважае важны справы.
Ручны мяч ён трэніруе, усіх да матчаў падрыхтуе.
Часам песенькі спявае, калі добры дзень ён мае.
Калі вусы настабурчыць — не прабуйце яго рушыць!
Нам „Капрысам” з ім хваліцца, канцэртамі — ганарыцца.
І з „Вясёлкай” пажартуе, паню Аню ён шануе.
Калі ў кухню ён загляне — зараз лепшым абед стане.
Высокі ўзровень трымае — за гэта кожны яго паважае.
Ідуць у школу дзеці з Бельска і аколіц без пратэсту.
Усім добра ведаць — нясем згэтуль веды.
А калі праблему маеш — да Дырэктара спяшаеш.
Бо тут з намі — перш за ўсё — наш Дырэктар — знаем, хто:
Васіль Ляшчынскі!

Верны прыяцель

(З народнага)

У аднаго селяніна быў вялікі сабака. Стаў ён стары і ўжо не мог вартаваць гаспадарскае дабро. Не хацелася селяніну дарма карміць сабаку. Вось ён узяў з сабой вяроўку і камень і пацягнуў сабаку да ракі.

Глядзіць на яго сабака разумнымі вачыма, быццам і разумее, што думае гаспадар.

Сеў гаспадар з сабакам у човен, ад’ехаў ад берага і стаў прывязваць камень сабаку да шыі. Пасля ўстаў і піхнуў нагой сабаку ў ваду.

Сабака нырнуў, але пры гэтым і човен крэпка скалануўся, а селянін не ўтрымаўся і сам зваліўся ў ваду.

Захліснула яго хваля, зусім ужо пачаў тануць. Раптам чуе — нехта цягне яго. А гэта яго сабака. Камень адвязаўся, і ён кінуўся ратаваць гаспадара. Схапіў зубамі за кашулю, выплыў з ім да берага і ледзь жывы расцягнуўся на беразе.

Заплакаў селянін, абняў сабаку, стала яму сорамна. Да самае смерці карміў і даглядаў ён вернага свайго прыяцеля.

Леаніла ЧАРНЯЎСКАЯ

Лявон ШЫРЫН

Жолуд

Зімка ўжо
Не за гарамі.
Зайчаняткі
Кажуць маме:
— З дуба ўпаў вунь
Жалудок,
Абмарозіць можа
Бок.
Засмяяўся
Жалудок,
Пад лісток у траўку —
Скок...
Зімку спаў ён
Пад лістком
І ўзышоў вясной
Дубком.

Ужыкі

Да гэтай пары ў нашым цыкле траплялі мы ў большыя мясцовасці — сядзібы гмін і ў горад Бельск. Гэтым разам прапаную адведаць невялікую вёску. Дарэчы, едучы дарогай з Бельска ў Локніцу можам нават не заўважыць, што па правым баку распаложаны Ужыкі. І якраз яны з'яўляюцца мэтай нашага сённяшняга падарожжа.

Распаложаныя каля Агароднік Ужыкі з'яўляюцца адной з найстарэйшых мясцовасцей у гэтых ваколіцах. Гэта даўняя фальварковая сяліба. Першая пісьмовая згадка пра яе паходзіць з Люстрацыі Падляшскага ваяводства ад 1576 г., аднак, праўдападобна, Ужыкі існавалі намнога раней.

Навакольныя жыхары назву Ужыкі звязваюць са словам *узкі*. Паводле вусных пераказаў, жыхары непадалёкіх Агароднік мелі атрымаць ад гаспадара фальварка ўчасткі, якія былі вельмі вузкімі. Адгэтуль і ўзялася назва маёнтка.

У XVI ст. ва Ужыках існаваў добра арганізаваны фальварак. У яго суседстве ў 1576 г. жылі 22 агароднікі, якія былі непасрэдна з ім звязаны. Агароднікі былі абавязаны адрабляць паншчыну на ўжытак фальварка. З цягам часу служэбны пасёлак ад занятку яго жыхароў пачалі называць Агароднікамі.

Буйнае развіццё Ужыкаў наступіла ў XVIII ст., калі Бельскае староства ўзначаліў Ян Клеменс Браніцкі. Ужыкі забяспечвалі двор Браніцкіх ткацкімі вырабамі. У палове XIX ст. Ужыкі былі перададзены ў прыватныя рукі. Арандатарам стаў Ян Врублеўскі. Сямейны пераказ роду Врублеўскіх паведамляе, што Ян атрымаў Ужыкі ва ўзнагароду за сумленную працу каля *царскага гасцінца*.

У жніўні 1915 г., так як і большасць акалічных вёсак, жыхары Ужыкаў адправіліся ў бежанства — масавую эвакуацыю беларускага насельніцтва Падляшша на ўсход Расіі, з якой вярнуліся ў 1921 годзе.

Рака Арлянка

З ваколіцай Ужыкаў і Агароднік звязаны цікавыя легенды. Непадалёку Агароднік знаходзіцца сажалка, якую мясцовыя называюць *Ямай без дна*. Як вяшчае легенда, жыхары гэтых ваколіц шматкратна прабавалі праверыць глыбіню сажалкі, аднак нікому гэтае не ўдалося.

Вельмі важным тапаграфічным элементам раёна з'яўляецца рака Арлянка. Калісьці была яна натуральнай мяжой паміж агароднікімі грунтамі і землямі вёскі Крывая. Гэтыя грунты называюцца *Задні луг*. Рака была таксама ўсходняй мяжой палёў вёскі Пасынкі. Тэрыторыю гэтую гутаркова называюць *Остравам*.

Міхась СЦЕПАНЮК

Як быць добрым мужам

парады Магдаліны

— Не памагай жонцы прыбіраць у хаце.
— Астаўляй брудныя шкарпэты побач ложка.
— Не выносць смецця.
— Дакучай цешчы.
— Не закрывай унітаза.
— Не хавай ежы са стала.
— Калі жонка мые падлогу, прыйдзі ў брудных чаравіках або гумоўцах і яшчэ для паляпшэння ейнага гумару вытрасі з іх салому.
— Калі жонка хоча спаць, ты не дазваляй ёй, наракай на яе ляноту.
— Калі жонцы баляць вушы, ты ўключы на ўвесь рэгулятар радыё.

„Павуцінне", *Магдаліна Панасюк*
(Белгімназія ў Гайнаўцы)

Музыка з кайфам

„PostScriptum": танцуем вольныя танцы!

Слухаю гурты, якія прэзентуюцца ў конкурснай частцы фестывалю „Басовішча". Год 2000. У пэўны момант на сцэну выйшлі музыкі і дзве энергетычныя дзяўчыны. Адна — вельмі круглых кшталтаў. Думаю сабе: „Такая тоўстая вакалістка? Можна быць кругленькай і падабацца публіцы?". Такія дзіцячыя, дурныя думкі. Ну, можа не такія ўжо дзіцячыя, бо мне тады было ўжо 18 гадоў, але культ зорак, паказваных па тэлебачанні і ў часопісах, ужо тады ўплываў на склад думкі маладых людзей. Так, можна не быць анарэксічкай, можна выглядаць як звычайная дзяўчына, а не як усе гэтыя мадэлькі і эстрадныя зорачкі, і прытым яшчэ добра спяваць! Да гэтага мяне між іншым пераканаў гурт „PostScriptum" з Мінска.

Іх гісторыя пачынаецца ўжо ў 1995 годзе. Гэта ж ветэраны беларускай музыкі! Пачаткі, як у большасці беларусаў, былі звязаны з рускай мовай, але ўжо ў 1997 годзе ў гурта „PostScriptum" з'явіліся беларускамоўныя творы. Дзякуючы гэтаму гурт у 2000 годзе трапіў на фестываль „Басовішча" і ад'ехаў адтуль з узнагародай. З таго часу песні гурту пачалі паяўляцца на розных складанках. „PostScriptum" пачаў часцей выступаць у клубах, у якасці госця ўдзельнічаў у розных фестывалях, напрыклад „Rock-Nasuja" ў 2004 годзе. Сярод не так шматлікіх інфармацый пра гурт знайшла я пару слоў пра альбомы. Аказваецца, што першы, паводле гурту, альбом „Дом на сініх узгорках", зразумела рускамоўны, з'явіўся ў 1997 г. Можа таму журналісты „Тузіна Гітоў" лічаць, што першы і адначасова дэбютны альбом „Вандроўка", дзе царыць беларуская мова і песня „Вольныя танцы", з'явіўся ў 2005 г., у дзесятую гадавіну існавання гурту.

Мала хто ведае, што пачаткова гурт меў быць акустычнай прапановай для слухача, але сябры гурту хутка вырашылі, што моцны, характэрны голас Юліі Сяўрук падыходзіць перад усім да гукаў электрычнай гітары. І так засталося. Да сёння, хаця ўжо не так часта, „PostScriptum" заварожвае сваю публіку поп-рокавым гучаннем, танцавальным рытмам і цікавымі мелодыямі.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 40

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 36:

Плакат, арамат, моц, яр, цягнік, ігрок, рад, скнара. Імам, яр, роцік, грак, акно, кот, ікра, як, ар, твар, яда.



Лявон літаратар

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Такі вось тэкст знайшоў я нядаўна ў варшаўскай Акадэміі мастацтваў: „Якаясь магутная сіла ёсць у безлічы пералятаючых над галавой птушак. Я ніколі не мог быць абыякавым адносна гэтага: яно робіць цябе малым, яно незразумелае табе. А гэта ж толькі галубы перад Сукенніцамі, чайкі на пералётах у вусця Віслы або галкі на начлезе ў ляску каля хаты, вакол цябе. І так жывеш ты з гэтай вялікай тайнай, якая калісь проста расфыркнецца, каб потым вярнуцца ізноў".

Набраны ён на друкавальнай машынцы па-беларуску, па-польску і па-англійску. У арыгінале польскай версіі, адручна паміж словамі аб ляску каля дома ўдзерлася напісаная фламастэрам „kawka". Мабыць, мала хто дадумаўся б, што гэтыя наскрозь паэтычныя сказы напісаў Лявон Тарасэвіч — як яго ўжо руцінна называюць — „сусветнай славутасці мастак з Валіл". А не толькі мастак. Таксама бард і стваральнік слова пісанага па-мастацку, без гэтак званых патрэб. Цяпер мінае дакладна чвэрць стагоддзя з моманту, у якім — як яго завуць сябры — Лёнік абараняў сваю тэарэтычную магістэрскую працу „...Прыступнасць пейзажу". Можна б мовіць, што гэта таксама і чвэрць стагоддзя Лёнікавай літаратурнай працы. У прынцыпе гэта не была праца навуковага характару, у паўсюднаакадэмічным разуменні, а паэма прозай (па-польску). Яе прамотарам быў прафесар Тадэвуш Дамінік, прызнаны графік і жывапісец-каларыст.

— Я не хацеў пісаць магістэрскай працы ў гісторыка мастацтва, бо тады лічыў, што гісторыкі мастацтва нічога не ведаюць аб жывапісе. Напісаў трыццаць шэсць лістоў. Паказаў іх Дамініку, а ён глянуў і кажа мне: „А хто гэта будзе чытаць, скараці напалову". І засталося шаснаццаць лістоў.

У архіве АМ гэтая праца ў камп'ютарнай раздрукоўцы налічвае толькі восем старонак. Пачынаецца з хвалюючага прызнання, якога пластычны запіс пасля быў скразной тэмай у мастацтве артыста: „...каторы ўжо раз еду з Валіл у Варшаву? Гэты доўгі, у дзвесце сорак кіламетраў падрамнік адмерваю вертыкаллю дрэў і прыдарожных слупоў. Паміж імі натыкаюся на карціны майго цяперашняга жыцця, зменлівага ў рытмах пораў года і дня. Хапае малога капрызу прыроды, каб усё радыкальна змянілася, робячы немагчымым вяртанне ў тое самае месца. Быўшы дзіцём я заўсёды быў ашарашаны гэтай раптоўнай стратай хвіліны: усё падлягае змене, хоць унушаю сабе, што бачу тыя самыя дрэва, поле, лес. Усведамляю сабе тады як мала на працягу нашага кароткага жыцця можам спазнаць і дасведчыць бязмежнай працягласці натуры. Хаця б дзеля гэтага варта быць мастаком".

Ужо тады можна было прыкмеціць рысы характару, індывідуальнасці творцы — бывала, што выклікаючыя „разладдзе" са светам: „...і я таксама не займаўся б мастацтвам, калі б не канфрантацыя з вонкавым светам. Гэта яна стварыла механізм пытанняў і адказаў, гэта яна вымагла на мне безупынныя пошукі". Амаль на канец прагучаць сцвярджэнні: „... На жаль, у вёсцы няма месца для мастацтва. Аспрэчванне вядомых праўд з'яўляецца атакай на культурны кансерватызм і заўсёды будзе выклікаць варожасць. У сваю чаргу прысутнасць у свеце мастацтва вялікіх асяродкаў, для мяне найбліжэйшым і найбольш натуральным з'яўляецца Варшава, пазбаўляе мяне прыватнасці майго малога беластоцкага краю. Таму мушу жыць у двух светах і так мабыць ужо застанецца. Спалучае гэта ўсё пейзаж прысутны ў дзвюх іпастасях".

Праз больш за дзесятак гадоў, у доктарскай дысертацыі, таксама пад загалоўкам „...Прысутнасць пейзажу", напісаў: „... я веру, што паступ чалавек будзе засвойваць новыя ідэі, датуль будзе перасякаць чарговыя межы спазнання. Не трэба выдумляць мастацтва, жыццё малюе само і само з'яўляецца мастацтвам, трэба толькі жыць. Гэта такое натуральнае, як хадзіць, бачыць, адчуваць, трэба мець толькі прычыны, каб гэта рабіць. Межы акрэслівае ўласная біяграфія, а яе немагчыма абдурыць".

Вядома, у літаратурнай частцы творчай працы Лявон Тарасэвіч спрабуе ў нейкі спосаб азначыць гэтае бачанне мастацтва, таксама праз прызму звязаную з тою біяграфіяй.

У тэксце не перакладзеным на польскую мову, а па-англійску выдадзеным у Мілане ў 2003 г. пісаў: „... як штогод снег у Валілах пакрыў усё беллю. Якраз беллю маё мастацтва вяртаецца да сваіх пачаткаў, пачынаючы штогадовую вандроўку колераў". У гэтым самым годзе ў публікацыі варшаўскага Цэнтра сучаснага мастацтва апынулася м.інш. такое пытанне: „... пісьмо ўзнікла з карцін, не наадварот. Ці мы чагосьці не страцілі беззваротна?"

Аб каларыстычных пераменах аўтара таксам можна прачытаць у яго ных літаратурных запісах. У машынапісе без даты з архіва аўтара апынулася вось такая думка наконт паяўляючагася ў яго працах блакіту (прыводжу яе вырваную з кантэксту): „Найчасцей ён у кампаніі жаўцізны і чырвані, але толькі для таго, каб павялічыць сваю сілу, каб дамінаваць. Ён з'яўляецца адзінай альтэрнатывай для ссохлага жыцця, недасяжнай мэтай, марай, да якой кіруецца чалавек. Ён з'яўляецца блакітам..." У адным з тэкстаў апублікаваных па-англійску мастак сцвярджае: „...колер гэта мая энергія /...колер прысутны заўсёды".

Адной з самых цікавых напісаных прац мастака з'яўляецца запіс габілітацыйнага даклада з 2001 г., у якім можа прачытаць радыкальную заяву: „... межы мастацтва не ёсць акрэсленыя і ніколі не будуць, паколькі гэта не межы вызначаюць рамкі мастацтва, а наадварот". Тэкст даклада пераплецены ў чырвоную вокладку. Кожны ліст тэксту ў дзевятнаццаць старонак папярэджаны лістом з каляровым ксераксам мастацкага твора, між іншым, старажытнаегіпецкімі, ренесанснымі, імпрэсіяністычнымі, якія перакліканцца з думкамі змешчанымі ў словах. У канцы гэтага даклада чытаем аб адчуванні лучнасці мастака і ўвогуле сучаснага мастацтва з яго папярэднікамі на працягу ўсіх вякоў: „... якія яшчэ нас чакаюць межы ў мастацтве? І ці ўвогуле мы павінны іх намячаць, абмяжоўваючы саміх сябе?/... адбіткі пальцаў адціснутыя ў мяккай гліне шчасліва захаваў застылы кальцыт. Я адчуваю вільгаць мокрай гліны".

З рэдакцыйна-літаратурнага пункту гледжання ўсе тэксты Лявона Тарасэвіча вылучаюцца шматкроп'ямі папярэджваючымі кожную думку. У размове з „Нівай" тлумачыў:

— Такім чынам канчаецца адзін аповед і праз шматкроп'е спасылаецца на наступны. Дзякуючы гэтаму можаш засяродзіцца на думках. Вось так я першы раз пісаў магістэрскую працу.

Калі прыгледзецца пісанаму баку яго творчай дзейнасці, аж просіцца, каб хтосьці выдаў анталогію. Сам маэстра з Валіл сцвярджае:

— Літаратурнае асяроддзе мяркуе іначай. На іх думку — пісанае слова падуладнае толькі ім. Некаторыя з маіх тэкстаў былі перакладзены на іншыя мовы, адзін нават на восем, — між іншым на карэйскую і кітайскую.

І дадае:

— Агулам я напісаў шмат тэкстаў, ды нашы пішучыя калегі іх не трактуюць сур'ёзна. Паказваюцца выданні з публікацыямі пра мастацтва на мовах іншых чым польская. Там ёсць мае тэксты, ды ніхто ў Польшчы на гэта не звяртае ўвагі.

За Чаромхай

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Panta rhei...

З поезда відаць нямнога з мясцовасці, праз якую пралягае чыгунка. Гэта адносіцца і да Чаромхі, якая — здаецца — пераніцавана рэйкамі ўздоўж і ўпоперак. Але калі падацца ў прасторы паміж пуцямі, тады можна пабачыць больш, чым з акон поезда, чым было ў ранейшым уяўленні пра мясцовасць.

З цэнтра Чаромхі, што насупраць чыгуначнай станцыі, падаюся ў невядомым мне дагэтуль паўднёвым напрамку. І вось менавіта там, як калісь Калумбу, адкрываецца перада мною тамашняя, невядомая мне дагэтуль, „Амерыка". Праўда, раней магу паўзірацца і на такія краявіды, якія відаць і з акон поезда. Гэта лакаматывы са снегачыстамі. Выгляд іх падказвае, што зімы ў нашым старонні не надта снежныя, што тыя носьбіты снегаачышчальнікаў у беспрацоўі. Бо тыя лакаматывы выконваюць зараз ролю мальбертаў, дзе прырода піша ржою карціны, якія здаюцца пацвярджаць славутае выказванне Геракліта — panta rhei — усё плыве, не толькі веснавы снег — усё падмятае пад сябе нястрымны час...

Неўзабаве паказваецца і насычальня шпал з даволі свежай шыльдай, аднак характэрнага паху крэазоту не ўдаецца мне спачатку ўлавіць. Толькі калі мінаю чатыры жылыя блокі, якія, мабыць, былі калісь пабудаваны для працаўнікоў гэтага прадпрыемства, паяўляецца лёгкі подых таго паху...

Чаромхаўская чыгунка высмактала земляробаў з навакольных палёў і яны зараз зарастаюць лесам. І я сабе, заміж біць абутак па асфальце, іду побач дарогі па прааранай паралельна ёй лясной супрацьпажарнай разоры, пры нагодзе выглядаючы грыбчыкаў. Марны гэта занятак побач адносна людной мясцовасці ў даабедні ўжо час, таму з пустымі рукамі даходжу да Бэрэзышча.

Гэта невялікая вёска, мо з дзесяці хат, якую з трох бакоў абступіў лес; толькі з поўдня асталося крыху паш і сенажацяў. У адной з загарад заўважаю невялікую атару з дваццаці-трыццаці авечак. Заводжу гутарку з пажылым мужчынам, які, абапіраючыся на мыліцы, выйшаў выглядаць аўтакраму. Гэтыя мабільныя лаўкі наведваюць вёску тры разы ў тыдзень — па аўторках, чацвяргах і суботах. Шкада толькі, жартуе мужчына, што ў тых магазінчыках немагчыма купіць ніякага развесяляльнага пітва. У адказ заўважаю яму, што ён ужо хіба сваю „норму" за столькі гадоў здолеў выканаць, а ён са мною згаджаецца, але ж малодшыя сваёй „долі" мусяць шукаць навонкі вёскі. Колькі цяпер у Бэрэзышчы пастаянных душ, мой субяседнік не хацеў рассакрэціць, затое ўдалося мне даведацца, што з дабытку ў вёсцы адзін конь і тры каровы, зямлю абрабляюць два гаспадары; яны абрабляюць палі, якія ад вёскі аддзяліў ужо лес. Але, мабыць, цяжка цяпер там што-небудзь у тыя палі ўкладваць, бо найбольш праўдападобным карыстальнікам ураджаю з'яўляюцца побач Бэрэзышча дзікі, якія і ўзрыхляюць шмат тамашняга сельскагаспадарчага арэалу.

Не толькі на тапаграфічных картах, але і на дарожных знаках гэтай вёскі віднее назва „Bereżyszcze". Я сумняваўся ў яе правільнасці, бо ж для такой назвы мясцовасці недзе побач яе павінна быць нейкае вадаёмішча, але такога там няма; затое там вельмі ахвотна растуць бярозы. Я і спытаў свайго суразмоўцу, як правільна называць ягоную вёску. „Бэрэзышчэ" — пачуў я ў адказ.

На заходнім канцы вёскі, з боку прыхадскіх Зубачоў, драўляная загарадка з трыма візантыйскімі крыжамі ў ёй. Два з іх драўляныя, а адзін цэментны. Вось той цэментны і падаў мне думку, што сакралізаваны нейкім чынам прадмет не падлягае ў нас кантэстацыі. Надпіс на згаданым цэментным помніку інфармуе, што ўдава паставіла той помнік у 1970 годзе мужу, які памёр у 66-гадовым узросце ў 1907 годзе. Праўду кажучы, магла жанчына столькі часу збірацца з ушанаваннем памяці свайго — відаць, намнога старэйшага — шлюбнага, але больш праўдападобнае тое, што выканаўца помніка ў працэсе творчай напругі пераблытаў лічбы, а паколькі на сваім опусе паставіў крыжык, дык прыйшлося гэта палічыць ужо неаспрэчнай святасцю...

Астаткі палёў, што асталіся паміж Бэрэзышчам і Зубачамі, акружаныя ўжо лесам і паволі далей аблясяюцца, найбольш, здаецца, як падказвала б назва найбліжэйшай вёскі — бярозамі. Шмат абшару займаюць пасадкі, шмат і самасеі. З боку Зубачоў, да якіх лес таксама падыходзіць упрытык, яшчэ ёсць большыя ўчасткі, дзе практыкуецца раслінаводства.

У пачатку Зубачоў прышэльца вітае незвычайны ландшафт: на даху першага будынка расце невялікі лясок. Голыя слупы ад шырокай брамы і прасторныя сцены зарастаючых пустазеллем сіласаў падказваюць, што там калісь адбывалася спроба калектыўнага гаспадарання.

Перад самой вёскай невялічкі ўказальнік інфармуе пра тамашнія могілкі. Яны недалёка і відаць там царкоўку выкананую з новага матэрыялу. Заходжу бліжэй храма, пры нагодзе азіраючыся на помнікі даўніны, на старыя намагільнікі. Адзін з іх, каменны, прысвечаны протаіерэю Івану Краскоўскаму, які жыў у 1816-1898 гадах і ў 1845-1894 гадах быў настаяцелем Зубачоўскага прыхода. Цалкам магчыма, што быў ён сваяком іншага Івана Краскоўскага, народжанага ў 1880 годзе ў недалёкіх Дубічах-Царкоўных, у святарскай сям'і, выдатнага палітычнага і асветніцкага беларускага дзеяча першай паловы XX стагоддзя...

Вяртаюся з могілак у вёску, дзе на лавачцы прыселі дзве пажылыя жанчыны, чакаючыя аўталаўкі; неўзабаве да іх далучыцца і трэцяя. Пытаю іх пра царкоўку, што на могілках, мяркуючы, што яна вельмі новая. Але жанчыны інфармуюць мяне, што той царкоўцы будзе звыш дваццаці пяці гадоў, а новай яна можа здавацца таму, што ў яе адносна новы дах. Была калісь там драўляная царкоўка, прывезеная ў Зубачы з Мілейчыч, але яна згарэла ад удару грому. Храм не быў тады застрахаваны і прыхаджанам прыйшлося яго адбудоўваць за свой кошт; сям'я адной з гэтых жанчын ахвяравала частку будаўнічага матэрыялу. У царкоўцы гэтай адбываюцца службы на Міколу, Спаса і Галавасека. Я здзівіўся, што на Спаса, калі ў прынцыпе ўсе тады падаюцца на Грабарку. Але жанчыны мне пацвердзілі, толькі адна з іх прызналася, што набажэнства на Грабарцы дае намнога большы рэлігійны зарад; вось сёлета дзеці завезлі яе на Святую гару, дзе яна наталіла душу малітвай.

Царква ў Зубачах

Пытаю яшчэ пра калгас. Калгас у Зубачах быў вялікі, і трымаўся ён даволі доўга; яшчэ пятнаццаць гадоў пасля прыходу Гамулкі мясцовыя гаспадарылі ў ім самастойна, пасля ён стаў філіяй калгаса ў Вульцы-Нурэцкай. Была тут вялікая абора з чырвонай цэглы, якую прадалі; купцы гаварылі, што з яе атрымаецца тры вялікія дамы.

Аўтакрама прыязджае ў Зубачы часцей чым у Бэрэзышча, бо ж і вёска тут большая. Раней была ў вёсцы сталая лаўка, але яна цяпер закрыта. З Зубачоў гімбус забірае ў чаромхаўскую школу чацвёрку дзяцей; трое дзяцей бярэ ён і з суседняй Баброўкі.

Прыхадская царква ў Зубачах была ўзведзена ў канцы XIX стагоддзя; ранейшая царква была згарэла. Можа для засцярогі ад бедстваў, пасля пажару згаданай раней могільнікавай царкоўкі ў наваколлі Зубачоў у 1970-х гадах былі пастаўлены шматлікія цэментныя крыжы-абярэгі, больш-менш аднолькавыя. Сама зубачоўская прыхадская царква выглядае звонку вельмі сімпатычна. Аднак цяпер людзі, ахопленыя гігантаманіяй, стараюцца ўнесці і сваю долю ў фармаванне краявіду. Гэтак жа і ў Зубачах, дзе ў драўляны царкоўны архітэктурны ансамбль нехта задумаў прыдаць і жалезны крыж-гігант з двухтаўровак; магчыма, што гэта сведчанне гіганцкай рэлігійнасці ягонага ахвяравальніка...

З Зубачоў падаюся ў Баброўку. Спатканую на тамашняй вуліцы пажылую жанчыну з мыліцамі пытаю пра граніцу. Інфармуе мяне яна, што граніца там за апошнімі хатамі. Дадае яна яшчэ, што калісь мясцовыя мужчыны, крыху выпіўшы, рашылі зведаць блізкае замежжа. Хутка іх павезлі ў Чаромху на ўчастак пагранаховы...

Іду я ў напрамку той граніцы, але не да канца вёскі, бо ж польска-беларускую граніцу я не раз бачыў. Заводжу гутарку з пажылой жанчынай, што выйшла да веснічак панадворка побач будынка, які падаўся мне вясковай святліцай. Сапраўды, там цяпер святліца, а раней была чатырохгадовая школа. Неўзабаве падышла да нас і малодшая жанчына. У ходзе гутаркі высветлілася, што яна з'яўляецца маёй равесніцай і амаль наймалодшай у вёсцы; ёсць толькі адна малодшая за яе.

У ходзе гутаркі заўважыў я дазорную вышку ў недалёкім ляску, якая амаль павісла над вёскай. Падумаў я, што гэта аб'ект польскіх пагранічнікаў, але жанчыны растлумачылі, што тая вышка за граніцай. Вяскоўцы, аднак, не заўважылі, каб замежныя пагранічнікі надта цікавіліся падзеямі ў Баброўцы... Вось мне прыгадаўся пры гэтай нагодзе пратэст жыхароў Коматаўцаў супраць будовы каля іхняй вёскі польскай дазорнай вышкі, якія нават паклікалі тэлебачанне, каб паказаць, як яны супраць. Але цікава, ці пратэставаў бы хто, калі б такая вышка вырасла зараз за граніцай...

З Баброўкі намерваюся пайсці ў Вульку-Нурэцкую. На маёй старэйшай карце ёсць пазначана нейкая дарожка паміж гэтымі мясцовасцямі; на навейшай нават больш выразная дарога. Але на месцы часам могуць чакаць нечаканасці. І мяне такая нечаканасць спаткала, калі я заміж нейкай балотністай дарогі праз сенажаці пабачыў гладкую як стол жвіроўку, якая адыходзіла ад асфальтоўкі паміж янцэвіцкімі хутарамі ў напрам-

працяг ☞10

9 ☞ працяг

За Чаромхай

ку Вулькі-Нурэцкай. Цяпер, у эпоху еўрасаюзных фондаў на інфраструктурныя мэты, тапаграфічныя нашы карты старэюць вельмі хутка...

Жвіровачка новенькая, яшчэ падмываюць яе дажджы, яшчэ не абрасла яна расліннасцю, перасякае яна даліну, з якой рэчка Пульва набірае магутнасці. Тут і сенажаці, кошаныя і некашаныя, некаторыя іх участкі ўзараныя, адзін вялікі палетак абсаджаны абрастаючымі пустазеллем кустамі парэчак; пустазелле з'яўляецца выдатным паказчыкам раслінаводчай дэкан'юнктуры. Жвіроўка рашуча пераходзіць у звычайную, крыху падсыпаную гравіем і аброслую кустоўем грунтавую дарогу, якая, пакінуўшы даліну Пульвы, становіцца пясочнай, вельмі копнай; жвіроўку насыпалі адно ў межах Чаромхаўскай гміны, да мяжы Гайнаўскага і Сямятыцкага паветаў.

Побач новай жвіроўкі толькі што адноўлены помнік-магіла з праваслаўным крыжам і чырвонай зоркай, абгароджаны толькі што выразанымі, яшчэ не памаляванымі штыкецінамі. На перакладзіне крыжа недарэчны надпіс: „KU PAMIĘCI POLEGŁYM." Калі б тая кропка стаяла словам раней, меў бы ён сэнс, бо можна было б прыняць, што гэта скарачэнне фразы „Ku pamięci żywym. W hołdzie poległym". Але ці многім нам хочацца думаць? І такім чынам з найшляхетнейшых нават матываў атрымліваецца іх карыкатура...

Да Вулькі-Нурэцкай мяшу нагамі сухі пясок. Побач дарогі расце малады, нецярэблены яшчэ лес з хвоек і ядлоўцаў; іншай расліннасці там амаль няма. І падумаць, што да аблясення гэтае месца мясцовыя мужыкі, мабыць са спадзяваннем ураджаю, абсявалі збожжам.

І так сабе даходжу да Вулькі-Нурэцкай. А перад вёскай, на дарозе ў Зубачы, чакае мяне мужчына, цікавіцца што мяне прывяло ў ягоную вёску, стараецца мне дапамагчы карыснымі інфармацыямі. У руцэ трымае кухонны нож і скардзіцца мне, што яго страшэнна кац мучыць. Праўда, тое мучэнне назваў ён больш крылатым словам, карыстаючыся атутэйшанай лексікай графа Аляксандра Фрэдры з ягонага трынаццатага раздзела „Пана Тавэвуша". На маю заўвагу, што варта было б ссячы парахнеўшую вярбу побач трох рытмічна аддаленых ад сябе крыжоў у драўляных агароджах, ад якой ужо адламалася адно рала, адказаў мне, што гэта справа „старэйшых". Даведаўшыся, што я з „Нівы", папрасіў ён сфатаграфаваць яго. Чаму ж бы не? Для здымка прыняў ён кананічную позу славутага князя Аляксандра Неўскага, адно трымаючы ў сваёй дзясніцы кухонны нож заміж кап'я...

Як на Страшным судзе: або туды, або сюды!

У Вульцы-Нурэцкай некалькі вуліц, якія на свой лад з'яўляюцца музеем, паказваючы прагрэс, які прайшла гэтая вёска. Тут вуліцы і з грунтавым палатном, і з брукам, і з асфальтам. На першым, з боку Зубачоў, скрыжаванні вуліц лясок крыжоў, які мне — разам з дарожным загадным знакам аб'езду справа або злева — паказаўся алегорыяй Страшнага суда: або туды, або сюды!

Заглянуў я яшчэ на тэрыторыю былога калгаснага комплексу; не буду яго апісваць, бо ўжо калісь яго апісаў. Нічога там не змянілася — руіны там як пасля бамбардзіроўкі. Не ведаю, у чыім тое месца ўладанні, але вельмі трывожыць мяне бестурботнасць уласніка. Неабгароджаны комплекс руін, з ямамі-капканамі, з высока павіслымі бетоннымі глыбамі толькі чакае каб праглынуць нейкую ахвяру. А мужык, хай сабе і на пасадзе важнага чыноўніка, не перахрысціцца пакуль гром не грымне.

На аўтобусным прыпынку, што перад вясковай крамай, высвятляецца прычына мучэнняў майго ранейшага суразмоўцы. У гэты дзень прадаўшчыца ўзяла выхадны і паехала да лекара. Ну і бедным сасмаглым вяскоўцам не стала галоўнага іхняга „лякарства", якое прадаецца толькі ў сталых крамах. Бо ж з віном ці півам некаторыя мужчыны жывуць як з жонкай: даверліва дзеляцца з гэтымі напоямі сваім часам і грашамі. Мо сямейнае заканадаўства ў нашым цывілізацыйным крузе, якое ў некаторых краінах выходзіць з традыцыйнага застою, дазволіць не толькі аднаполыя сем'і, але ў будучыні пашырыць суб'екты гэтага асноўнага грамадскага гурточка таксама і на чыста спірытуальныя асобы.

Аб тым, што зямля беларуская багатая на таленавітых людзей, на старонках „Нівы" пісалася неаднаразова. Дзякуй Богу, пасылае ён нам выдатных пісьменнікаў, музыкаў, скульптараў, паэтаў, ну і зразумела мастакоў. Напрыклад такіх, аб сайце якіх сёння пойдзе гаворка — Алесь і Юлія Шатэрнікі.

Падрабязная інфармацыя аб мастаках, а гэта бацька і дачка, месціцца ў інтэрнэце па адрасе **http://shaternikart.org.** Першая старонка сайта выкананая даволі проста — яна падзяляецца на дзве часткі: злева, як мае быць, выйсці да іншых рубрык, а справа — найбольш значныя падзеі, што адбыліся ў творчым жыцці мастакоў. Праўда, зважаючы на абнаўленні, гэтай старонцы здараюцца яны не вельмі часта. Так, апошняя навіна датуецца лютым 2009 года, але пра тое, каторага года той люты, можна даведацца толькі перайшоўшы на англамоўную версію сайта.

Цікава, што галоўная старонка, а гэта „Навіны", бадай, адзінае месца на сайце, дзе расповед ідзе пра абодвух мастакоў адразу. Выйсці да іншых рубрык маюць асабістую прыналежнасць да кожнага з іх. Спярша ідуць рубрыкі Юліі.

Калі зазірнуць у яе „Біяграфію", то даведаемся, што мастачцы 27 гадоў, нарадзілася яна ў Мінску, але цяпер жыве і працуе ў Амерыцы. Згодна расповеду на сайце, творы Юліі Шатэрнік выстаўляліся ў Беларускім нацыянальным палацы культуры, Музеі рускага сучаснага мастацтва Аляксандра Глэйзера ў Джэрсі-Сіці, Міжнароднай галерэі Стэла ў Парыжы, Nectar Gallery (Лонг-Айлэнд), Vanderplas Gallery (Нью-Йорк) і інш. Шмат якія працы захоўваюцца ў прыватных калекцыях у розных краінах свету.

Далей знаходзіцца рубрыка „Галерэя", якая тэматычна падзяляецца на тры падрубрыкі — „Кветкі", „Жанчыны" і „Абстракцыя".

Творчасць Алеся Шатэрніка прадстаўлена на яго старонках сайта. Яны, з большага, аналагічныя рубрыкам Юліі. Адным з цікавых фактаў творчай біяграфіі гэтага сябры суполкі мастакоў „Пагоня" было стварэнне ў 2005 годзе разам з вядомым беларускім мастаком Аляксеем Марачкіным Беларускага Звана Свабоды. Як распавядаецца ў ягонай рубрыцы „Біяграфія", гэты „бронзавы звон часова канфіскаваў дыктатарскі рэжым падчас так званай Беларускай рэвалюцыі ўвясну 2006 года".

Колькасць выставак Алеся, канешне, большая, чым у ягонай дачкі. Назвы гэтых выставак змешчаны ў аднайменнай рубрыцы. Таксама працы Алеся можна пабачыць у Дзяржаўнай Трацякоўскай галерэі ў Маскве, Белым доме ў Вашынгтоне, Мастацкім музеі Зімерлі Ратгэрс Універсітэта Нью-Джэрсі, C.A.S.E Музеі Рускага сучаснага мастацтва ў горадзе Джэрсі-Сіці, Міжнароднай галерэі Стэла ў Парыжы. Творы Алеся Шатэрніка таксама знаходзяцца ў шэрагу прыватных калекцый у ЗША, Расіі, Італіі, Ізраілі, Галандыі, Германіі, Бельгіі, Беларусі ды іншых краін.

Варта адзначыць, што творца працуе не толькі як жывапісец, але і як скульптар. Таму ў ягонай рубрыцы „Галерэя" знаходзяцца падрубрыкі „Карціны" і „Скульптуры".

Цікавай адметнасцю сайта з'яўляецца Main gallery page — асобная старонка, дзе месцяцца выйсці на „галерэйныя" старонкі абодвух мастакоў, з выявамі першых твораў той ці іншай калекцыі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Разнастайны верасень

Пры падвядзенні спартовых вынікаў месяца і вызначэнні лепшых выявілася, што спектр відаў на гэты раз досыць шырокі. Таму і назіраецца ў спісах такая „каляровая" стракатасць нібы ў вераснёўскім лесе.

1. Віктар Зуеў (бокс) — адзіны прадстаўнік Беларусі, які на чэмпіянаце свету па боксе, што прайшоў у італьянскім Мілане, здолеў дабрацца да п'едэстала. У катэгорыі звыш 91 кілаграма ён упэўнена выйграў у паўфінале ў Дзяніса Сяргеева з Расіі — 11:2, але на большае сіл не стала. У выніку — бронза.

2. Рызван Гаджыеў (вольная барацьба) заваяваў бронзавы медаль на чэмпіянаце свету, ён вызначыўся ў катэгорыі да 55 кг. Гэтага ён дамогся праз суцяшальны паядынак, адолеўшы на дыване Красіміра Крастанава з Брытаніі.

3. Васіль Кірыенка (веласпорт) на прэстыжнай шматдзённай велагонцы „Вуэльта" у складзе каманды „Кас д'Эпань", якая заняла 2-е месца, выдатна папрацаваў на лідара і пераможцу Алехандра Валвердэ, а сам заняў высокае 16-е месца (у шаснаццатку трапілі ажно 9 іспанцаў і толькі 7 іншаземцаў).

4. Андрэй Міхневіч (штурханне ядра) на турніры Гран-пры ў Заграбе стаў трэцім.

Жанчыны „засвяціліся" ў мінулым месяцы крыху ярчэй. Таму аддаем ім дадатковую пазіцыю.

1. Кацярына Карстан (акадэмічнае веславанне) у Брэсце на чэмпіянаце Еўропы, традыцыя правядзення якога толькі адраджаецца, як і чакалася, выйграла залаты медаль на каронная дыстанцыі 2000 метраў.

2. Вікторыя Паўловіч (настольны тэніс) на чэмпіянаце кантынента, што прайшоў у нямецкім Штутгарце, стала трэцяй у адзіночным разрадзе. У паўфінале ў драматычным паядынку з сямі сетаў сёмая ракетка Еўропы зусім крыху саступіла кітайцы Ву Цзядуа, якая прадстаўляе Германію. Акрамя гэтага Віка разам з Яўгенам Шчацініным стала сярэбранай прызёркай чэмпіянату Еўропы сярод змешаных параў.

3. Меліта Станюта (мастацкая гімнастыка) на чэмпіянаце свету па мастацкай гімнастыцы стала 4-й па выніках фіналу шматбор'я. Да таго здабыла бронзавы медаль у практыкаванні з абручом.

4. Алена Філіпава (вольная барацьба) — адзіная з беларускай каманды, каму ўдалося выйграць медаль— бронзавы — на першынстве планеты.

5. Вольга Гаварцова і Тацяна Пучак (тэніс) выйгралі фінальны матч у парным разрадзе на турніры СТА ў кітайскім Гуанчжоў. У вырашальнай сустрэчы беларускі адолелі інтэрнацыянальны дуэт Кіміка Датэ Крум (Японія), Цянцян Сун (Кітай). Аналагічнага поспеху пара дасягнула і на турніры ў Ташкенце.

6. Ірына Бабецкая (біятлон) на летнім чэмпіянаце свету на лыжаролерах выйграла кросавую гонку на 3 кіламетры. Гэта новае імя ў айчынным біятлоне.

Што датычыць зборных, то расчаравала мужчынская баскетбольная. Пахвалім жаночую зборную краіны па стральбе з лука (трэнер Барыс Ісачанка) — на чэмпіянаце свету ў Карэі яна заняла вышэйшае ў гісторыі 4-е месца. Беларускія спартоўцы выйгралі ажно 16 медалёў (7 залатых, 5 сярэбраных і 4 бронзавыя) на чэмпіянаце Еўропы ў экзатычным спорце — водналыжным відзе за электрацягай, які прайшоў у чэшскім горадзе Гавіржове. А камандамі месяца бясспрэчна сталі дзве мастацка-гімнастычныя зборныя — звычайная (Меліта Станюта, Святлана Рудалава, Любоў Чаркашына), якая ўзяла серабро на першынстве свету, і каманда ў групавых практыкаваннях — два другіх і адно трэцяе месцы. Адзначым таксама вяслярскія экіпажы — мужчынскую чацвёрку-парную і жаночую васьмёрку, якія заваявалі па серабры ў Брэсце.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Новая дарога

Кляшчэлеўскі самаўрад станоўча ставіцца да дарожных інвестыцый. Сёлета была асфальтаваная гравейка з Рэпчыч у Дабрываду. Дарога даведзена адно да вёскі. Частка вуліцы надалей застаецца брукаванай. Гэта задача для Старостава, паколькі дарога лічыцца павятовай. Але дабрывадцы — аптымісты і вераць мясцоваму самаўраду, што пасля пракладкі вулічнай каналізацыі Павятовае староства ў Гайнаўцы паложыць асфальт на вясковым бруку, як і на адрэзку дарогі ў напрамку чыгуначнага прыпынку. Жыхары Дабрывады варты такой інвестыцыі.

(ус)

Патрэбны расклад

Зараз расклады аўтобусаў ПКС зніклі з прынынкаў, бо іх паздзіралі, выскраблі або пакрэмзалі хуліганы. Так ёсць на ваяводскай дарозе ад Юшкавага Груда да Навасадаў каля Гайнаўкі. Вельмі патрэбны яны ў Новай Луцэ, Тарнопалі, Лазовым (з гэтага прыпынку ездзяць таксама жыхары Навін), Новым Ляўкове ды ў Нараўцы. Добра, што аўтобусы ездзяць рэгулярна і без спазненняў. Для пасажыраў расклады — важная справа. Вось канкурэнцыя — уласнікі прыватных аўтобусаў і мікрааўтобусаў — лепш дбаюць пра расклады свайго транспарту. Яны забяспечаны ад дажджу і пылу. Іх не сарвеш — яны за тоўстым шклом і дошчачкі таблічак прыкручаны на шрубы!

(яц)

Канкурэнтка Старой Белавежы

Паляна Зуброўка — гэтак называецца адно з месц на тэрыторыі Белавежскай пушчы, дзе можна раскласці г. зв. турыстычны касцёр. Яно непадалёку ад падобнага яму і хіба найбольш вядомага сярод турыстаў і экскурсантаў месца ва ўрочышчы Старая Белавежа. Мае яно прыстрэшкі, лавы і пасярэдзіне топку. Арганізавала яе ў 2004 годзе Надлясніцтва Белавежа, на палатне колішняй лясной вузкакалейкі. Надлясніцтва месца гэтае здало ў арэнду суполцы „Іва", якая вядзе ў Белавежы вядомыя гасцініцу і рэстаран „Зуброўка" ды рэстаран „Парковая". У той жа час месцу прысвоілі назву Паляна Зуброўка.

На Паляне Зуброўка гасцініца арганізуе мерапрыемствы з кастром для сваіх гасцей. Прасторнае месца дазваляе памясціць тут нават шматлюдныя канферэнцыйныя групы. Кастры ладзяцца з багатым рэгіянальным меню (напрыклад — дзік печаны на ражне). Удзельнікам да яды і гульні падыгрывае музыкант або капэла. Гасцей з аддаленай на 5 кіламетраў гасцініцы давозяць на месца на брычках, павозках або на аўтобусах — у залежнасці ад жадання або атмасферных умоў. Прыстрэшкі дазваляюць арганізаваць мерапрыемствы нават падчас дажджу або снегаападу.

Пётр БАЙКО

НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ

Фота Андрэя Ялозы

Перад базарам у Гайнаўцы

Ад некалькіх гадоў былі клопаты з продажам сельскагаспадарчых вырабаў перад брамай рынку па вуліцы 3 Мая ў Гайнаўцы. Прадаўцы неаднойчы хадзілі да бурмістра з прашэннем, каб дазволілі ім тут прадаваць, але канчалася гэта без ніякіх вынікаў. 15 мая дайшло нават да сустрэчы прадаўцоў з уладамі горада, менавіта з намеснікам бурмістра і трыма прадстаўнікамі паліцыі ды ўласніцай рынка Ажахоўскай. На гэтым спатканні было дамоўлена, што ўласніца рынка згаджаецца на выдзяленне месца без ніякіх аплат. За кіёскам было вызначана месца на гандаль і была павешана табліца з надпісам: „Miejsce dla handlu dochodzącego". Ды тое месца не задаволіла некаторых прадаўцоў. Большая частка не адмовілася прадаваць перад брамай. Убачыўшы паліцыю, уцякалі яны на рынак. Калі паліцыянты ад'язджалі, вярталіся на сваё месца. Паліцыя ўсё прасіла і тлумачыла, што ў гэтым месцы гандаль забаронены, а нават страшыла штрафам. Праз нейкі час знікла табліца, а пасля ўласніца рынка забараніла прадаваць і ў пазначаным месцы.

Нейкі час паліцыя разганяла прадаўцоў, гандлюючых перад брамай, урэшце кінула іх турбаваць. Дадумваюцца, што новы камендант дамовіўся з бурмістрам наконт гэтага. Цяпер кожны з прадаючых задаволены, і прыбывае ўсё больш дробных гандляроў. Задаволены таксама пакупнікі, што могуць тут набыць танныя свежыя сельскагаспадарчыя вырабы. У крызіс пенсіянераў неабходна ахапіць асаблівай апекай.

Андрэй ЯЛОЗА

З Кляшчэлеўскай гміны

Пячэнне бульбы

У нядзелю, 20 верасня, над Рэпчыцкім вадаёмам адбылася традыцыйная імпрэза „Пячэнне бульбы". Надвор'е паспрыяла арганізатарам, ды і зацікаўленых мерапрыемствам было шмат. Атракцыёнам, апрача пячэння бульбы (а пяклася яна на вогнішчах і варылася ў традыцыйных саганах), было смакаванне рэгіянальных страў, падрыхтаваных агратурыстычнымі кватэрамі. Смачную ежу падрыхтавалі дзве прадпрымальніцы з Дабрывады і тры з Рэпчыч. Дырэктар Кляшчэлеўскага ГОК Марыя Клімовіч адзначыла, што вельмі багатае меню запрезэнтавалі менавіта мясцовыя гаспадаркі. Печанай бульбай і стравамі частаваліся ўдзельнікі імпрэзы. Арганізатары задбалі аб апал на вогнішча і сталы для спажывання яды. Пры застоллі, гармоніку (іграў дабрывадскі музыкант) і народнай песні хутка мінаў час. Імпрэза пачалася ў 15 гадзін і доўжылася да вечара. Былі конкурсы з узнагародамі. Калі я наведаў Рэпчычы на адвячорку, дык сустрэў гаманлівую кампанію пры застоллі і вогнішчах. Плыла дыскаполавая музыка з магнітафона, а побач мяжуючага з вадасховішчам сасновага маладняку стаялі аўтамабілі гасцей і прагульваліся пары, як на даўнейшых вясковых фэстах бывала. Бо гэта і было свята ў Кляшчэлеўскай гміне.

Уладзімір СІДАРУК

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — думку Максім Багдановіча.

1. складны паўкруг з пласцінак, якім абмахваюцца ў духату = 40 _ 41 _ 14 _ 1 _;
2. вынік зліцця дзвюх палавых клетак у працэсе апладнення = 32 _ 31 _ 33 _ 18 _ 19 _ 5 _;
3. хвароба скуры, пры якой валасы на галаве зблытваюцца і зліпаюцца ў камяк = 44 _ 43 _ 12 _ 42 _ 2 _ 4 _;
4. сталіца на Дняпры = 36 _ 37 _ 15 _ 16 _;
5. замерзлая вада = 10 _ 22 _ 23 _;
6. частка сушы, якая вострым вуглом выходзіць у мора = 21 _ 20 _ 17 _;
7. лічэбнік, які плавае ў Мазыры і Пінску = 7 _ 6 _ 29 _ 30 _;
8. танец з самбадрома = 24 _ 25 _ 13 _ 26 _ 11 _;
9. група спевакоў для выканання вакальных твораў = 38 _ 34 _ 35 _;
10. глыбокая металічная лыжка, якой разліваюць страву = 8 _ 28 _ 27 _ 3 _ 9 _ 39 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 35 нумара

Ківу, кран, імя, шышка, дача, русалка, перац, танец, Амур, Лейбніц, Пысін, чытальня, вішня.

Рашэнне: **Калі верыш усяму прачытанаму, лепш не чытай.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лявону Федаруку** з Рыбал і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

У Мастаўлянах усе нараджаліся маленькімі (6)

(пачатак у № 33)

У Мастаўлянах я была чатыры разы, апошні раз паехала з польскамоўным знаёмым, які пачаў хвастацца перад дзедам з бабай сваімі гістарычнымі ведамі.

— Pan katolik, — наступіў яму адразу на язык стары, — pan biełaruskaj mowy nie lubi. Pan chacieu by, jak Kalinouski, kab nas tut nie było...

І як па загадзе, дзед пачаў яшчэ больш вешаць сабак на Каліноўскім.

— Ależ ja lubię waszą mowę i Białorusinów, — тлумачыўся знаёмы.

Прызнанне ў любові нічога не памяняла, наадварот, у вачах нашага субяседніка мы разам паказаліся ненадзейнымі госцейкамі. І адразу, замест пра Каліноўскага, мова пайшла пра смярдзючы капіталізм. У якасці прыкладу сацыяльнай несправядлівасці стары прывёў мізэрную цану воўны.

Від Мастаўлян з боку Свіслачан

— Калісь за кілаграм воўны тры метры салетры можна было купіць. А сёння — што? За кілаграм паўтара злота даюць.

Дзед сам рашыў адпомсціць капіталізму і паліць старой воўнай у печцы. Ды атрымалася не так як хацеў, людзі пачалі прыдзірацца, злавацца...

За што?

— Бо ад падпаленай воўны смурод вялікі ідзе.

* * *

Аповед пра воўну, хоць паўсюдны і прапагандысцкі ў нашай глыбінцы, на радзіме рэвалюцыянера меў дадатковае значэнне. Ён наклікаў тэкстыльныя вобразы першай паловы XIX стагоддзя, пачаткі капіталізму ў нашай старонцы. Кастусь Каліноўскі меў непасрэднае дачыненне да гэтай справы. Яго бацька Сямён Сцяпанавіч Каліноўскі ў 1835-1844 гадах у Мастаўлянах меў ткацкую фабрыку (пасля фабрыку перавялі ў Якушоўку). Маёнтак, які арандавала сям'я, складаўся з двух фальваркаў і двух вёсак з 344 прыгоннымі сялянамі. Сям'я гаспадарыла на 240 дзесяцінах зямлі. У маёнтку была карчма і вадзяны млын.

У фабрыцы Каліноўскіх вырабляліся ільняныя абрусы, сурвэткі, палатняная бялізна ў дзевяці гатунках. На выраб тавару ўжывалася 250 пудоў ільну, які вырошчваўся на навакольных землях. Вырабы прадаваліся фабрыкантам у Гродзенскай губерні, Беластоцкай вобласці, у Вільні, Мінску.

Будынак былой школы імя К. Каліноўскага

Кастусь Каліноўскі правёў у Мастаўлянах першыя 11 гадоў. Верагодна, што на аснове сямейнага прадпрыемства ён грунтаваў свае меркаванні аб прыгоне і капіталістычнай гаспадарцы. Архіўныя крыніцы падаюць, што ў мастаўлянскай фабрыцы працаваў адзін майстар і чатырнаццаць вольнанаёмных рабочых.

Тут была польска-беларуская дошка ў гонар К. Каліноўскага

Памяць аб прамысловай ініцыятыве Каліноўскіх у сённяшніх Мастаўлянах не захавалася.

— Не было ў нас ніякай фабрыкі, — рашуча заявілі жанчыны, якія выседжвалі на лавачцы ля Зарэцкіх. Сярод іх была і настаўніца мясцовай школы імя Кастуся Каліноўскага. Пра іх славутага земляка ведалі тут, што нарадзіўся ў іх, змагаўся і загінуў на шыбеніцы.

Жанчыны не маглі паверыць, што палатно і абрусы выраблялі з ільну, якім былі абсеяны ўсе іхнія навакольныя палі. Сёння там непраходныя аблагі, парослыя буйнымі, здзічэлымі лугамі і кустоўем. Падобна выглядала тут справа з гістарычнай памяццю.

* * *

Першы раз у Мастаўляны завітала я ў 1985 годзе. З перспектывы часу відаць як погляды пра Каліноўскага змяняліся тут разам з палітычнай рэчаіснасцю. Як добра памятаю, у вяскоўцаў ніколі не было адназначнага грунтоўнага пункту гледжаня на тэму Вікенція Канстанціна Каліноўскага. Каліноўскі не цікавіў мясцовых сялян так як хацелі б яго фанаты і даследчыкі. Мастаўлянцаў, як класічных беларусаў, больш цікавіла тое хто і чаго завітаў у іх вёску. Яны, пакуль нешта сказалі, прынюхваліся да намераў, сачылі за жэстамі, правяралі. Пасля, каб задаволіць гасцей, гаварылі нешта кшталту: *Каліноўскі змагаўся з панамі і яго за гэта павесілі.*

Першы раз завандравала я туды з сябрамі-басаўцамі ў другой палове 1980-х гадоў. Тады мы абышлі пешшу Беласточчыну ад Бобры па Буг. Вядома, не маглі абмінуць двара ў Мастаўлянах. Запамяталіся старыя сосны ў былым маёнтку і іх сучасныя гаспадары Арцёмчыкі, якія не ведалі як успрымаць наш візіт. Пасля мы адпачывалі ля старой плябаніі, гутарылі ў атмасферы зразумення з бацюшкам. Людзям падабалася, што прыйшлі да іх беларусы. Каліноўскі таксама падабаўся, ён быў тады «наш» беларус...

(працяг будзе)

03.10 — 09.10

(22.03. — 20.04.) 3-7.10. адкрыюцца перад табой новыя магчымасці. На шмат спраў глянеш інакш, дзякуючы чаму нанова зацікавіць цябе штосьці даўно пахаванае. Пільнуйся: хтосьці толькі ўдае мілага, а дзейнічае табе на шкоду.

(21.04. — 21.05.) Аж да паловы месяца будзеш у дасканалым настроі, поўны досціпу і вялікай энергіі. У пачуццях не адцягвай справы, бо страціш шанц на рамантычную прыгоду. З 7.10. (да 11.10.) пагражаюць табе папсаванне здароўя, праблемы ў каханні, клопаты з дзецьмі.

(22.05. — 22.06.) Агромная колькасць энергіі, каб папхнуць уперад справы. Шмат возьмеш на сваю галаву, але з усім справішся. З 8.10. (да 12.10.) магчымыя канфлікты з законам, у сям'і, непаразуменні, хтось схоча ўтаіць ад цябе інфармацыі.

(23.06. — 23.07.) Непаразуменні з кіраўніцтвам, схільнасць да неабдуманых рашэнняў. Аж да паловы месяца добры настрой, хуткія рэакцыі і бравурнае дзеянне прынясуць поспехі.

(24.07. — 23.08.) Калі ты ў фінансавым доле, хутка выкараскаешся. З 8.10. (да 12.10.) зрэалізуеш кожны свой намер, а ведамі і кампетэнтнасцю выклічаш павальнае ўражанне. Адданасць сэнсоўным на тваю думку справам прынясе неспадзяваныя рэзультаты.

(24.08. — 23.09.) 6-11.10. поспехі ў вучобе, твая мудрасць, вопыт і ўпэўненасць у тым што ведаеш дазволяць на трапныя рашэнні. 2-6.10. некаторыя справы пойдуць інакш, аднак не будзеш задаволены (разлічваючы на сляпую ўдачу, можаш сабе зашкодзіць). 8-12.10. празмерная колькасць абавязкаў не дасць табе зрабіць найважнейшага.

(24.09. — 23.10.) Першыя два тыдні ты пад апекай шчодрай Цэрэс. 7-11.10. не гуляй коштам асобы закаханай у цябе. Можаш перакрочыць мяжу добрага густу. Пазбудзься чорных думак і стэрэатыпаў.

(24.10. — 22.11.) Аж дзве першыя дэкады ненайлепшыя. Цэлы месяц добры на рамонты і парадкаванне, таксама ў душы. Для кар'еры можаш шмат прысвяціць. Добра прадказваючае знаёмства можа аказацца пшыкам. Калі чакаюць цябе нейкія працэдуры, запланую іх паміж 5 і 17.10.

(23.11. — 22.12.) Твае прафесійныя поспехі могуць не ладзіцца з сямейным жыццём. Але дзякуючы стараанням, цярплівасці і кампетэнцыям гарантуеш сабе прафесійны поспех. Што ты народжаны ў кашульцы адчуеш з 8 (да 12.10.) — нават з найгоршай кабалы выйдзеш без страт. З 9.10. (да 13.10.) можаш мець дылему: выехаць за мяжу ці астацца. У каханні дай сабе час.

(23.12. — 20.01.) Пры поўні Месяца (4.10.) цяжэй дагаворышся з людзьмі. Паявіцца неахвота ў пары, цяжка будзе ўсё афармляцца ва ўстановах. Перад табой вялікія выклікі, перад якімі не варта ўцякаць (шмат цябе навучаць). Будзеш мець ахвоту шмат што радыкальна змяніць у сваім жыцці.

(21.01. — 19.02.) 3-7.10. будзеш адважны, самаўпэўнены, лёгка ажыццявіш свае ідэі. 2-6.10. з-за тваіх нервовых паводзін, хаатычных выказванняў і непасляпоўнасці ў паводзінах цяжка будзе з табой дагаварыцца. 7-11.10. — недахоп стабільнасці ў любоўным жыцці, абыякавасць да пачуццяў іншых.

(20.02. — 21.03.) Асабліва спакойны месяц. Хоць кіпіць у пачуццях. Засяродзься на тым, што табе прыходзіць лёгка. Поспех у бізнесе можаш мець дзякуючы крытычнай ацэнцы сітуацыі. 3-7.10. можаш мець клопаты з-за памылкі, якую ўсё паўтараеш.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960